

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Калі ў чужых творах ты пазнаеш свой свет і сябе ў ім, мастак робіцца для цябе блізкім і сваім.**

СТАР 6



**Каб добра адпачыць, трэба добра падрыхтавацца. Мы паспрабавалі знайсці неабходныя рэчы для пляжнага адпачынку і параўнаць кошты на іх...**

СТАР 8


Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

12 ЛІПЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 127 (27492) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


■ З першых вуснаў

# ДЗЯРЖАВА І ІНВЕСТАР: ГУЛЬНЯ НА РОЎНЫХ



**На мінулай сесіі Нацыянальнага сходу было прынята некалькі законапраектаў, якія павінны істотна паўплываць на эканоміку Беларусі. Сярод іх праекты законаў «Аб інвестыцыях», «Аб аўдытарскай дзейнасці», «Аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці» і іншыя. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімірам ПАНЦЮХОВЫМ, каб больш падрабязна распытаць пра зробленае.**

**— Уладзімір Іванавіч, на вясновай сесіі ваша камісія падрыхтавала да разгляду 9 законапраектаў. Якія з іх найбольш актуальныя?**

— Я паставіў бы на першае месца па важнасці праект Закона «Аб інвестыцыях». Праектам забяспечваецца прастата і празрыстасць замацаваных у законе нормаў і паняццяў, што выключае дваякае тлумачэнне дзяржорганамі, юрыдычнымі асобамі і грамадзянамі. Законапраект таксама накіраваны на роўную дзейнасць усіх інвестараў на тэрыторыі нашай краіны — як нацыянальных, так і замежных. Пры гэтым дзейнасць замежных інвестараў будзе абмяжоўвацца, толькі калі гэта пагражае інтарэсам нацыянальнай бяспекі, здароўю насельніцтва, правам і свабодзе іншых асоб, ахове навакольнага асяроддзя, гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Рашэнні аб абмежаваннях будуць прымацца толькі на падставе заканадаўчых актаў.

Акрамя гэтага законапраекта, я б вылучыў праекты законаў аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і бюджэту пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за 2012 год.

**— Яшчэ з 2001 года ў нашай краіне дзейнічае Інвестыцыйны кодэкс. Чаму зараз спатрэбілася прыняцце Закона «Аб інвестыцыях»?**

— Нягледзячы на дзейнасць Інвестыцыйнага кодэкса, у многіх замежных інвестараў узнікала асцярога за свае сродкі, якая і спыняла іх, не давала смела ўкладваць грошы ў беларускую эканоміку. Яны баяліся, што ўлады могуць нацыяналізаваць іх гаспадарку, забараніць перадачу сродкаў іншым асобам і падобнага. Новы закон дае ім гарантыі, што такога не здарыцца, што яны будуць працаваць на роўных умовах з айчыннымі інвестарамі і могуць не перажываць за свае грошы.

**Некаторыя інвестары не столькі баяцца, колькі хочуць атрымаць альбо замацаваць за сабой неналежнае: прыродныя багацці і рэсурсы. Але ёсць рэчы, якія не прадаюцца.**

Асобная частка законапраекта гарантуе абарону правоў інвестараў, у тым ліку іх грошай і маёмасці ад нацыяналізацыі і рэквізіцыі. Гарантуецца таксама вырашэнне спрэчак паміж інвестарам і Рэспублікай Беларусь. Замежныя інвестары змогуць бесперашкодна перавесці за межы Беларусі кампенсацыю, якая прадугледжана законапраектам пасля ўрэгулявання такіх спрэчак, і іншыя правамерна атрыманыя ад інвестыцый сродкі.

СТАР. 2

# ДОБРАЯ БОЧКА — ЛЁГКАЯ НОШКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Вядомы на Глусчыне бондар Уладзімір Станкевіч цяпер не хвалюецца, што яго рамяство можа трапіць у лік зніклых. У майстра ёсць добры вучань і паслядоўнік Сяргей Івашкоў — навучэнец глускай гімназіі. Юнак ахвотна працуе з дрэвам і засвойвае тэхналогію стварэння старажытнага сялянскага посуду. Разам з настаўнікам малады бондар наведвае раённыя, абласныя і рэспубліканскія кірмашы і фестывалі.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Барыс СВЯТЛОЎ, міністр культуры:**

***«Фестываль «Славянскі базар у Віцебску» стаў сусветным брэндам, які прыцягвае тысячы артыстаў, прыхільнікаў прыгожага, турыстаў з розных краін, прадстаўнікоў СМІ, усіх, хто цікавіцца музычнай культурай. За мінулыя гады на форуме мастацтваў у Віцебску пабывалі дзясяткі тысяч найлепшых прадстаўнікоў культуры розных краін, а сам фестываль ператварыўся ў безумоўны сімвал яднання славянскіх і іншых культур на аснове гуманістычных ідэй міру, дабра і стварэння».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.07.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8810,00 | ▼ |
| Еўра | 11490,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1080,32 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 23° |
| Віцебск | + 26° |
| Гомель | + 28° |
| Гродна | + 19° |
| Магілёў | + 27° |
| Мінск | + 23° |

■ Май на ўвазе

# TAX FREE ЗАПРАЦУЕ ПРАЗ МЕСЯЦ

**Тэхналогію работы аператара сістэмы Tax Free ў Беларусі плануецца канчаткова дапрацаваць і ўзгадніць на працягу бліжэйшага месяца. Пра гэта расказала карэспандэнту «Звязды» намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.**

Нагадаем, што аператарам Tax Free выбрана рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белмытнясэрвіс». Па словах Ірыны Наркевіч, разам з «Белмытнясэрвіс» у гэтым праекце будуць таксама задзейнічаны Беларусбанк і «Белпошта», найбуйнейшыя крамы краіны і іншыя зацікаўленыя арганізацыі. «Праблем з вяртаннем грошай па Tax Free, — лічыць намеснік міністра, — быць не павінна. Ужо сёння на ўсіх асноўных пунктах пропуску ў абодвух кірунках, а таксама ў аэрапорце абсталяваны спецыяльныя пункты вяртання грошай. На працягу 30 дзён будзе канчаткова дапрацавана і ўзгоднена тэхналогія працы аператара, складзены неабходныя дагаворы і пагадненні з усімі ўдзельнікамі праекта». Пасля гэтага на працягу некалькіх месяцаў праект будзе знаходзіцца ў пілотнай стадыі, на якой будуць адпрацаваны нюансы функцыянавання інфармацыйнай сістэмы, што забяспечвае ўзаемадзеянне ўсіх удзельнікаў. «Пасля гэтага любая гандлёвая арганізацыя зможа далучыцца да праекта, і сістэма запрацуе на поўную магутнасць», — падкрэсліла Ірына Наркевіч.

Дарэчы, сістэму Tax Free — механізм вяртання падатку на дабаўленую вартасць з беларускіх тавараў, набытых у рэспубліцы замежнікамі, — у Беларусі ўвялі з 1 студзеня 2013 года. Мінімальны кошт пакупак пры вяртанні ПДВ — Br800 тыс. Тавар павінен быць набыты ў адной краме на працягу аднаго працоўнага дня. Сума падатку не вяртаецца ў выпадках, калі тавар у Беларусі вызвалены ад ПДВ або па ім ужываецца паніжаная стаўка (напрыклад, гэта датычыцца харчовых тавараў). Акрамя таго, не падлягаюць вяртанню ПДВ падакцызныя тавары. Выкарыстанне гэтага механізму ў Беларусі паспрыяе павышэнню іміджу краіны, асабліва пры правядзенні міжнародных культурных, спартыўных і іншых мерапрыемстваў, і павысіць прывабнасць беларускага гандлю для замежнага пакупніка.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**



# ГЛЯДАЧ ПРАГАЛАСАВАЎ ЗА «БАЗАР» РУБЛЁМ

**Віцебск у ліпені традыцыйна становіцца «галоўным» горадам не толькі Беларусі, але і ўсяго былога СССР. А ўсё дзякуючы фэсту, які даўно ўжо ведаюць ва ўсім свеце. «Базар» зноў правіць баль і зноў здзіўляе...**

## Квіткі — «базарны» дэфіцыт

Учора афіцыйна стартаваў XXII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». І, бадай, адзіны дэфіцыт на бягучым «базары» — квіткі на фестывальныя канцэрты, спектаклі.

На 100% сёлета выкананы план па рэалізацыі квіткоў. На іх продажы дырэкцыя фэсту ўжо зарабіла каля 20 мільярдаў рублёў. Квіткі прадаюцца ўжо больш за месяц. Як заўсёды, вельмі добра раскупляліся квіткі на гала-канцэрты адкрыцця і закрыцця фестывалю: глядач прывык, што ў іх заўсёды бярэ ўдзел «зорны» склад артыстаў. Быў аншлаг, напрыклад, на сольным канцэрце Крысціны Арбакайтэ. Пры гэтым традыцыйна фестываль мае вялікую дзяржаўную падтрымку: распараджэннем кіраўніка дзяржавы сёлета пералічана на правядзенне фэсту больш за 8,3 мільярда рублёў...

Па-ранейшаму фестываль фінансуецца і з бюджэту Саюзнай дзяржавы: у бягучым годзе на суму больш за 24,8 мільёна расійскіх рублёў. Каля 500 мільёнаў рублёў бюджэтных грошай было ўкладзена ў рамонт і мадэрнізацыю Летняга амфітэатра, якому, нагадаю, сёлета чвэрць стагоддзя. Дарэчы, не забылі ў Віцебску таго, хто быў генератарам ідэі будаўніцтва амфітэатра: Уладзіміру Грыгор'еву, былому першаму сакратару абкама КПБ, а потым — надзвычайнаму паўнамоцнаму паслу, сёння адкрываецца помнік.

Мясцовая ўлада ўклала каласальныя грошы ў рамонт дарог, азеляненне...

Дзякуючы таму, што напярэдадні «базару» ў Віцебску адбыўся карпаратыўны фэст «Газпрама», у якасці спонсарскай дапамогі каля 2 мільярдаў рублёў было патрачана на рамонт грымёрных другой па значнасці канцэртнай пляцоўкі «базару» — канцэртнай залы «Віцебск».

Цікава, што і ў месцы арганізацыі харчавання шмат грошай уклалі. А кухараў перад «базарам» адпраўлялі на вучобу, як і афіцыянтаў.



Фота Надзеі БУЖАН.

## «Зорка» для Эдзіты П'ехі!

«У Віцебску я адчуваю сябе, як дома. Тут асаблівая атмасфера: людзі ўсміхаюцца, могуць проста падысці і сказаць «Добры дзень, П'еха!», — падзялілася на «базары» прыемнымі эмоцыямі Эдзіта Станіславаўна П'еха, народная артыстка СССР, папулярная савецкая і расійская эстрадная спявачка, актрыса. Яе імянная «зорка» ўчора з'явілася на «Алеі зорак» ля Летняга амфітэатра. У любові да Віцебска і «базару» спявачка прызналася падчас цырымоніі адкрыцця сваёй «зоркі».

СТАР 2

■ Надвор'е

# ДАЖДЖЫ І НАВАЛЬНІЦЫ

**У бліжэйшыя выхадныя ў Беларусі чакаюцца дажджы, у асобных раёнах — навальніцы.**

12 ліпеня дажджы на большай частцы тэрыторыі Беларусі будуць суправаджацца навальніцамі. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымы град. Уначы 11-17 градусаў вышэй за нуль, днём ад 18 да 20 градусаў па захадзе да 27-29 градусаў па ўсходзе краіны, паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.

У выхадныя таксама на значнай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, месцамі — моцныя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Уначы плюс 10-17 градусаў, па ўсходзе да 19 градусаў. Удзень ад 18 па захадзе да 26 па ўсходзе рэспублікі.

У пачатку наступнага тыдня надвор'е стане паляпшацца. Спачатку на захадзе, а ў сярэдзіне тыдня і ва ўсходніх рэгіёнах дажджы ў асноўным спыняцца. Уначы плюс 10-15 градусаў, днём 18-20 градусаў на паўночным усходзе Віцебскай вобласці да 24-26 градусаў на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ФІЛЬМЫ ХІЧКОКА АБВЯСЦІЛІ СПАДЧЫНАЙ ЮНЕСКА

ЮНЕСКА ўключыла ў спіс сусветнай спадчыны дзевяць нямых фільмаў Альфрэда Хічкока. У спіс увайшлі фільмы, якія Хічкок зняў з 1925-га па 1929 год. Сярод гэтых карцін — меладрама «Сад асалод» (рэжысёрскі дэбют Хічкока), камедыя «Шампанскае», а таксама трылеры «Рынг» і «Шантаж». Супрацоўнікі архіва Брытанскага інстытута кіно аднавілі арыгінальныя плёнкі ўсіх нямых фільмаў Хічкока, за выключэннем трылера «Горны арол» 1927 г., арыгінал якога лічыцца згубленым. Акрамя гэтага, хронаметраж некаторых фільмаў, у прыватнасці, «Сад асалод», быў павялічаны за кошт знойдзенага матэрыялу. На працу па аднаўленні было выдаткавана тры мільёны долараў, якія Брытанскі інстытут кіно атрымаў ад прыватных фондаў і фізічных асоб.

### КОТ НАБРАЎ НА ВЫБАРАХ У МЕКСІЦЫ 600 ГАЛАСОЎ

Кот па мянушцы Морыс здолеў набраць на рэгіянальных выбарах у Мексіцы каля 600 галасоў выбаршчыкаў. Мянушку Морыса выбаршчыкі ўпісвалі ў спецыяльна адведзеную графу для незарэгістраваных кандыдатаў у мэры і губернатары. Некаторыя выбаршчыкі нават прымалёўвалі да надпісу каціныя мыскі або адбіткі лап. Сам кот «балатаваўся» ад горада Халапа ў штаце Веракрус. Там яго «вылучыў» гаспадар, які завёў свайму гадаванцу мікраблог і старонку на Facebook. У яго праграме гаварылася пра тое, што кот мае намер пазбавіць родны горад ад пацукоў (гаворка ішла пра карупцыянераў).

### ТУРЫСТАЎ ПАПРАСІЛІ ЎСТРЫМАЦЦА АД СМАЖАННЯ ЯЕК У ДАЛІНЕ СМЕРЦІ

По словах супрацоўнікаў амерыканскага нацыянальнага парку Даліна смерці, рэйнджарам даводзіцца прыбіраць як самі яйкі, так і шкарлупіны і ўпакоўку ад іх на назіральных пляцоўках і паркоўках. Тым жа, хто вельмі хоча праверыць, ці можна пасмажыць у Даліне яечню, рэйнджары рэкамендавалі выкарыстоўваць патэльні ці хаця б харчовую фольгу. Да турыстаў супрацоўнікі Даліны смерці звярнуліся напярэдадні святкавання юбілею тэмпературнага рэкорду, які быў зафіксаваны ў парку 10 ліпеня 1913 г. Тады тэмпература паветра ў Даліне смерці, самым засушлівым нацыянальным парку ЗША, дасягнула плюс 57 градусаў па Цэльсіі.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ФРАНЦІШАК ЗАПАТРАБАВАЎ ПРЫНЯЦЬ ПРЫСВЕЧАНУЮ ЯМУ СТАТУЮ



Статуя Папы Рымскага Францішка, усталяваная ля кафедральнага сабора Буэнас-Айрэса, была перанесена ў яго музей. «Неадкладна прыняць» яе, па звестках аргентынскай прэсы, запатрабаваў асабіста Папа. Пантыфік, які да абрання на папскі пасад быў архіепіскапам Буэнас-Айрэса, патлумачыў, што ён «супраць культу асобы». Скульптура была перанесена ў музей, прысвечаны Францішку, які павінен адкрыцца праз некалькі тыдняў. У ім плануецца выставіць асабістыя рэчы Францішка, якія захаваліся з часоў яго служэння ў Аргенціне. Па некаторых звестках, ідэя стварэння музея пантыфіку таксама не спадабалася. Статуя Францішка ў поўны рост была ўстаноўлена ў садзе ля кафедральнага сабора ў канцы чэрвеня і прыцягвала ўвагу мясцовых жыхароў і турыстаў, якія з ёй фатаграфаваліся.

КОРАТКА

Урачыстасці, прысвечаныя вяртанню цудатворнага Гарбацэвіцкага абраза Божай Маці, пройдуць 14 ліпеня ў Бабруйскім раёне. З-за неналежных умоў захоўвання рэліквія не застанецца ў Гарбацэвічах, а пасля ўрачыстасцяў абраз будзе перавезены ў будынак Бабруйскай епархіі. Гістарычнае месца абраз зойме пасля таго, як у вёсцы будзе пабудавана новая царква.

Канадскі спецыяліст Глен Хэнлан, з якім Беларуская федэрацыя хакея (ФХРБ) падпісала кантракт для працы ў якасці галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай, будзе зарабляць каля $ 170 тыс. за год.

У аграгарадку Заазер'е Полацкага раёна 20 ліпеня пройдзе трэці ягадны фестываль «Чарніца», у якім возьмуць удзел больш за 120 камандаў па 4 чалавекі ў кожнай. Выхад камандаў на старт прызначаны на 7 гадзін раніцы. Збор чарніц будзе праводзіцца да 12.00.

# ШТО ВЫ ЧАКАЕЦЕ АД ЛЕТНЯГА АДПАЧЫНКУ?



**Ніна Міхнова, галоўны рэдактар дырэкцыі радыё тэлерадыёкампаніі «Магілёў»:**

— Сёлета летні адпачынак у мяне пачаўся датэрмінова: яшчэ ў маі я пабывала ў Крыме. Разам з двума сынамі, якім 13 і 9 гадоў, а таксама з маёй маці, я пайшла ў пешы крымскі паход. Было цяжка, але ўспаміны незабыўныя. Мне здаецца, што самае галоўнае ў адпачынку — не тое, дзе і як, а каб абавязкова была змена ўражанняў. Трэба з'ехаць са звыклага асяроддзя, каб засумаваць па дому і працы. Мне гэта ўдалося.

Так што гэтым летам я не адпачываю, а працую. І на выхадныя і святочныя дні, вольныя ад сямейных клопатаў, планую паездзіць па Беларусі.



**Галіна Краўчанка, дырэктар бібліятэчнай сістэмы горада Магілёва:**

— Я адпачываю на лецішчы ў Магілёўскім раёне і атрымліваю ад гэтага асалоду. За мінулы год у маім жыцці было так шмат людзей, сустрэч, падзей і ўражанняў, што я вырашыла правесці свой водпуск ціха, на прыродзе. Тут у нас птушкі спяваюць, лісце дрэў калышацца. Навокал прыгожыя кветкі. І, вядома, градкі, невялікія. Ведаеце, я корпаюся ў зямлі і атрымліваю ад гэтага задавальненне. Я, калі шчыра, магла б фінансава дазволіць сабе і замежную вандроўку. Я так і рабіла ў мінулыя гады, і гэта вельмі добра. Але цяпер я адпачываю на беларускай прыродзе, і гэта не горш. Усім, хто збіраецца ў летні адпачынак ці яшчэ плануе яго, я параю слухаць сябе. Калі хочацца новых уражанняў — не эканомце грошы і едзьце. А калі хочацца проста спакою на лецішчы — дазвольце сабе гэта і будзьце шчаслівыя.



**Юрый Каласоўскі, настаўнік беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 1 горада Магілёва:**

— Сёлета я хачу наведаць Лельчыцы і Брагін, і ў такім разе здзейсніцца мая даўняя мара аб тым, каб пабываць ва ўсіх райцэнтрах Беларусі, а іх у нас увогуле 118. За дзясятак гадоў вандровак па Беларусі мне ўдалося пабачыць велізарную колькасць помнікаў прыроды, гісторыі і архітэктуры.

На маю думку, адпачынак павінен быць актыўным, з яркімі ўражаннямі і незабыўнымі ўспамінамі. Таму для мяне найлепшы адпачынак — гэта падарожжа. Пры гэтым зусім не трэба ехаць далёка, за мяжу, паколькі ў нашай Беларусі ёсць багата славутасцяў, цікавых месцаў. Я раю турыстам наведаць на Віцебшчыне старажытны горад Оршу, радзіму Уладзіміра Караткевіча. На Міншчыне — мястэчка Ракаў з унікальным музеем братоў Янушкевічаў, на Гродзеншчыне — радзіму Адама Міцкевіча ў Завоссі. На Берасцейшчыне наведайце Пінск, сапраўдную жамчужыну Палесся, на Гомельшчыне — мястэчка старавераў — Ветку з надзвычай цікавым музеем, а ў Магілёўскай вобласці — старажытны Успенскі манастыр у Пустынках каля Мсціслава. Добрых вам летніх падарожжаў!

**Запісала Ілона ІВАНОВА.**

# ГЛЯДАЧ ПРАГАЛАСАВАЎ ЗА «БАЗАР»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На гэтай «зорнай алеі» ўстанаўліваюцца пліты з імёнамі лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Дарэчы, сярод іншых на цырымоніі адкрыцця «зоркі» прысутнічаў таксама вядомы ўнук спявачкі — Стас. Барыс Святлоў, міністр культуры Беларусі шчыра пажадаў, каб імя Стаса калісьці з'явілася сярод «зорак» на алеі, як і яго маці, дачкі Эдзіты П'ехі, Ілоны Бранявіцкай.



У фестывальнай сталіцы.

Фота Надзеі БУЖАН.

## Галоўнае — бяспека

Сёлета кіраўніком дырэкцыі «базару» стаў Аляксандр Сідарэнка. Яму яшчэ няма 40 гадоў, мае дзве вышэйшыя адукацыі і вопыт працы ў культуры. У прыватнасці, займаў пасаду намесніка начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама.

А ці былі сёлета нейкія «фантастычныя» патрабаванні з боку «зорак» мастацтваў?

— Нейкіх звышнатуральных запатрабаванняў ад «зорак» не было, — прызнаўся ён. — А калі што, ужо ёсць добры вопыт працы дырэкцыі фэсту: можам і гатовы, скажам так, капрызы задаволіць...

Новаспечаны генеральны дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» таксама расказаў, што сёлета на «базары» будзе пастаўлены рэкорд: святлодыёдных экранаў і сетак у Летнім амфітэатры будзе, як ніколі раней. У гэтым змаглі пераканацца тэлегледачы, якія ўчора глядзелі трансляцыю канцэрта адкрыцця фестывалю.

Сёлета падчас фэсту робяцца асаблівыя захады па забеспячэнні бяспекі. Як растлумачыў прадстаўнік службы бяспекі беларускага Прэзідэнта, цяпер праводзіцца больш пільны асабісты агляд тых, хто прыходзяць на канцэрты. Гэта тлумачыцца тым, што спецыяльныя прыборы не могуць зрэагаваць на небяспечныя прадметы, выробленыя з пластыку. Вядома, што на аб'ёмным прынтары цяпер можна нават зброю «раздрукаваць». Таму на «базары» гледачоў прадстаўнікі міліцыі літаральна «абдымаюць»: жанчыны ў форме — жанчын, мужчыны, адпаведна, мужчын. Як пажартаваў вышэйназваны прадстаўнік, для журналістаў «зрабілі выключэнне»: прыгажуні з праваахоўных органаў будуць «абдымаць» прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва...

XXII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будзе доўжыцца па 15 ліпеня. Удзел у ім бяруць прадстаўнікі мастацтваў з больш як 30 краін. Фестывальную акрэдытацыю на «базары» атрымалі каля 5 тысяч чалавек. На фэсце працуюць каля 500 прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі з 14 краін. У афіцыйнай праграме фэсту — 60 мерапрыемстваў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ГЕАПАЛІТЫКА І ТЭХНАЛОГІІ — новыя выклікі інфармацыйнай бяспекі краіны

**11 ліпеня ў Мінску адкрылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Інфармацыйная бяспека як складнік нацыянальнай бяспекі дзяржавы». Форум сабраў спецыялістаў адпаведнага профілю з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Азербайджана, Туркменістана і Узбекістана.**

**Мы публікуем артыкул міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алега ПРАЛЯСКОЎСКАГА, прысвечаны тэматыцы канферэнцыі.**



Рэспубліка Беларусь — гэта дзяржава, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, на мяжы двух вялікіх геапалітычных утварэнняў — Еўрапейскага саюза і постсавецкай прасторы. Адным з важных наступстваў такога становішча з'яўляецца аб'ектыўна абумоўленая адкрытасць беларускай інфармацыйнай прасторы. І гэтая адкрытасць уяўляе сабой найважнейшую асаблівасць, якая патрабуе свайго асэнсавання і ўліку пры выпрацоўцы дзяржаўнай палітыкі ў сферы інфармацыйнай бяспекі.

На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічае 1.523 друкаваныя СМІ, 89 тэлевізійных СМІ і 166 радыёвяшчальных СМІ. Пераважная большасць з іх (1287) — недзяржаўныя.

На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь распаўсюджваецца каля 4 тысяч замежных друкаваных СМІ, абсалютная большасць якіх — выданні Расійскай Федэрацыі, а таксама друкаваныя СМІ Украіны, Казахстана, Германіі, ЗША, Вялікабрытаніі, Літвы, Польшчы, Нідэрландаў, Італіі, Латвіі, Фінляндыі. Агульны разавы тыраж замежных друкаваных СМІ складае каля 1 млн асобнікаў. Распаўсюджваецца больш за 130 замежных тэлеканалаў, патэнцыйная аўдыторыя якіх — больш за 50% усіх хатніх гаспадарак.

З году ў год Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь забяспечваецца дзяржаўны кантроль за выкананнем заканадаўства і прыярытэтаў нацыянальнай бяспекі суб'ектамі інфармацыйнага рынку.

Аднак сёння Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, якая ўжо ў 2015 годзе павінна стаць асновай новага інтэграцыйнага ўтварэння — Еўразійскага эканамічнага саюза. Спецыфіка гэтага паслядоўнага працэсу «еўразійскай інтэграцыі» заключаецца ў тым, што ён ажыццяўляецца на рамачных умовах членства Расійскай Федэрацыі ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі. З юрыдычнага пункту гледжання гэта азначае, што Беларусь, якая пакуль не далучылася да СГА, вымушана ў бліжэйшыя гады лібералізаваць сваю інфармацыйную прастору, пры гэтым не атрымліваючы адпаведнай лібералізацыі рэжыму інфармацыйнага абмену з трэцімі краінамі.

Такім чынам, удзел у інтэграцыйных утварэннях на постсавецкай прасторы павышае ўзровень канкурэнцыі на айчынным інфармацыйным рынку, патрабуе ўліку новых тэхналагічных і паводзінскіх мадэляў у рабоце СМІ, востра ставіць пытанні эканамічнай заможнасці рэдакцый, канкурэнтаздольнасці ўмоў працы журналістаў у дзяржаўных СМІ ў параўнанні з прыватнымі альбо замежнымі.

На гэты геапалітычны выклік напластоўваецца выклік тэхналагічны.

Расце значнасць інтэрнэту як крыніцы грамадска і палітычна значнай інфармацыі для беларускай аўдыторыі. Паводле вынікаў даследаванняў Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта, у 2005 годзе 47,6% беларускай аўдыторыі аддавалі перавагу атрыманню інфармацыі па пытаннях палітыкі менавіта з друкаваных СМІ, па пытаннях культуры і эканомікі — 44,1% і 39,5%, а з сеціва — усяго 2,7 %, 2.8% і 4%. Да 2012 года сітуацыя кардынальна змянілася: інтэрнэт апярэдзіў друкаваныя СМІ (суадносіны адпаведна 34,8%, 33,1%, 27,1% у друкаваных СМІ і 34,9%, 33,4%, 34,9% па пералічаных тэмах у інтэрнэту).

Спецыфікай інтэрнэт-прасторы з'яўляецца абсалютная, нават часам залішняя свабода камунікацыі ў гэтым асяроддзі — як для спажыўцоў, так і для вытворцаў кантэнту. Таму забеспячэнне інтарэсаў нацыянальнай бяспекі ў гэтай сферы патрабуе ініцыятыўнай, апераджальнай палітыкі дзяржаўных і дружалюбных ім суб'ектаў у працы з беларускай аўдыторыяй. Немагчыма «адгаварыць» інтэрнэт-аўдыторыю чытаць той ці іншы сайт, можна толькі прыцягнуць яе на свой сайт і такім чынам паўплываць на інфармацыйную карціну.

Рэспубліка Беларусь зрабіла свой выбар на карысць інфарматызацыі грамадства, на карысць руху насустрач інфармацыйнай рэвалюцыі і атрымання ад яе максімальных выгад. Такі падыход шматразова за апошнія некалькі месяцаў агучваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. А гэта значыць, што апісаныя вышэй найважнейшыя зрухі ў характары масавай камунікацыі на тэрыторыі Беларусі патрабуюць глыбокага тэарэтычнага і практычнага асэнсавання і выпрацоўкі прынцыпова новай інфармацыйнай стратэгіі дзяржавы.

Ніколі раней у Беларусі не была запатрабавана такая колькасць разнастайных інфармацыйных прадуктаў: артыкулаў, фота-, відэа- і аўдыяматэрыялаў, а галоўнае — светапоглядных і паводзінскіх матрыц, усярэдзіне якіх гэтыя прадукты генеруюцца. Як можна адказаць на гэты выклік? Ці можа дзяржава сфарміраваць такое мноства пазіцый? Якім іншым суб'ектам павінна належаць першынство ў гэтай працы? Які характар ўзаемадзеяння розных суб'ектаў медыярынку ў гэтых новых умовах?

Гэтыя і іншыя пытанні настойліва патрабуюць сёння свайго рашэння, з'яўляюцца асновай новай парадыгмы ў працы тэарэтыкаў і практыкаў інфармацыйнай сферы. Пры гэтым вельмі важна пытанні інфармацыйнай бяспекі, бяспекі ў галіне масавай інфармацыі і камунікацый бачыць у кантэксце іншых відаў бяспекі — як складнік шматмернай бяспекі Рэспублікі Беларусь і нашага рэгіёна.

# ДЗІЦЯЧЫЯ ДАМЫ МОГУЦЬ СТАЦЬ НЕПАТРЭБНЫМІ

**Праз паўтара года дзіцячыя дамы ў Беларусі павінны знікнуць. Самі ўстановы, можа, і ліквідуюць, аднак нікуды не дзенуцца сотні маленькіх сірот, якія зараз там гадуюцца. Спецыялісты лічаць найлепшай альтэрнатывай прыёмныя сем'і. Але ў такім выпадку прыёмных бацькоў трэба вучыць правільна абыходзіцца, знаходзіць паразуменне з былымі выхаванцамі інтэрнатаў. А вось менавіта тут і хаваюцца падводныя камяні. Пра гэта і ішла гаворка на «круглым стале», арганізаваным прадстаўніцтвам Міжнароднага дзіцячага фонду ў Рэспубліцы Беларусь.**

— Безумоўна, у ідэале інтэрнаты павінны зачыніцца натуральным шляхам — з-за таго, што ў іх элементарна не будуць трапляць новыя дзеці. Аднак практыка паказвае, што дагэтуль кожны пяты сірата ў краіне змяшчаецца ў дзіцячы дом. А навукоўцы даказалі, што найбольш паспяхова адаптавацца дзіцяці да рэальнага жыцця можна толькі ў сям'і. Ніякі самы фешэнебельны інтэрнат не заменіць малому тату і маму, хай сабе і прыёмных, — лічыць **дырэктар прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Беларусі Ірына МІРОНАВА**. — Зараз у нашых прыёмных сем'ях выхоўваецца каля сямі тысяч дзяцей. Асаблівую ўвагу надаем кантролю за тымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якіх узялі да сябе адзінокія людзі. Гэта робім рознымі шляхамі — праз участковага ўрача, праз выхавальнікаў у дзіцячым садку...

Аднак не ўсё бязвоблачна і ў прыёмных сем'ях. Бо не заўсёды нават кваліфікаваны педагог ці псіхолаг можа дапытацца ў малога, з чым ён сутыкнуўся ў сваёй ранейшай біялагічнай сям'і.

— Інстытут замяшчальнай сям'і дзейнічае ў Беларусі паралельна з практыкай усынаўлення вось ужо пятнаццаць гадоў.



**Дзве з паловай тысячы малых вярнуліся за шэсць гадоў у свае біялагічныя сем'і.**

Аднак дагэтуль, на жаль, не ўсе бацькі ўсведамляюць, што яны павінны быць для малога не толькі татам і мамай, але і ў нейкай ступені спецыялістамі, — лічыць **педагог-псіхолаг сацыяльна-педагагічнага цэнтра Лунінецкага раёна Наталля СКАМЕЙКА**. — Сітуацыю па краіне ў апошні час істотна выпраўляе навучанне прыёмных бацькоў па адмыслова распрацаванай праграме ПРАЙД. У прыватнасці, з яе дапамогай дарослы чалавек рыхтуецца непасрэдна пад патрэбы, праблемы і запатрабаванні канкрэтнага дзіцяці. А ўжо ўзяўшы да сябе малога, працягвае вучыцца працаваць з ім як з членам сваёй сям'і.

Як відаць, для паляпшэння працэсу выхавання сірот, як і для іх саміх, у нашай краіне робяцца адчувальныя крокі. Але відаць і тое, што трэба здзейсніць яшчэ вельмі і вельмі шмат гэтых крокаў, каб паняцце «дзетдом» сапраўды стала анахранізмам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# У ГРОДНЕ З'ЯВЯЦЦА... ТАКСІСТЫ-МАТАЦЫКЛІСТЫ

**Выклікаць яшчэ нязвыклае для Беларусі таксі можна будзе, набраўшы нумар 107. А перад паездкай пасажыру належыць апрануць спецыяльную экіпіроўку, якая складаецца са шлема, курткі і пальчатак.**

— Матацыклы ў якасці таксі — гэта хутчэй магчымасць развеяцца і атрымаць новыя ўражанні, — адзначыў аўтар ідэі, дырэктар таксі «Бертэль» Сяргей Бертэль, які сам захапляецца матацыкламі. — Спачатку замовы на мотатаксі будуць рабіцца загадзя, але пасля завяршэння тэставага перыяду матацыкл будзе падавацца кліенту за той жа час, што і звычайнае таксі, за 5-7 хвілін. Але асаблівага даходу ад гэтай паслугі мы не чакаем. Гэта больш прапаганда байкерскага руху, магчымасць для тых, хто захапляецца матацыкламі, пакатацца з байкерам і адчуць атмасферу свабоды і драйву.

Па інфармацыі з сайта «Блог Гродна», кожны матацыкл у сярэднім каштуе 20 тысяч долараў, да таго ж расход паліва у гэтых транспартных сродкаў большы, чым у аўтамабіляў, таму кошт, адпаведна, вышэйшы, чым паслугі звычайнага таксі. Аплата будзе пагадзінная, без уліку кіламетражу. Так, за 15 хвілін паездкі давядзецца заплаціць 80 тысяч рублёў. Як сцвярджаюць аўтары ідэі, гэтага часу дастаткова, каб нават пры моцных заторах праехаць праз увесь горад. Паколькі ў Беларусі не ўвесь год спрыяльны для мотапрагулак, то новы сэрвіс, хутчэй за ўсё, будзе даступны для кліентаў з мая па кастрычнік. Для работы патрабуецца спраўны матацыкл з тэхаглядам, а вадзіцельскі стаж байкера павінен перавышаць 2 гады.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# ДЗЯРЖАВА І ІНВЕСТАР...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зноў-такі, за час дзеяння Інвестыцыйнага кодэкса значна змянілася прававое поле ў нашай краіне. Былі прынятыя Падатковы і Бюджэтны кодэксы, змяніліся падыходы да аказання дзяржпадтрымкі, інвестарам далі права на заключэнне дагавароў з Рэспублікай Беларусь.

Некаторыя інвестары не столькі баяцца, колькі хочуць атрымаць альбо замацаваць за сабой неналежнае: прыродныя багацці і рэсурсы. Але ёсць рэчы, якія не прадаюцца. Гэта тое, што належыць нам і нашым нашчадкам, якія будуць тут жыць пасля. Мы не збіраемся прадаваць свае прыродныя багацці. Гэта замацоўваецца законапраектам «Аб канцэсіях», які таксама разглядаўся парламентарыямі падчас вясновай сесіі.

Пасля набыцця юрыдычнай моцы законамі «Аб інвестыцыях» і «Аб канцэсіях» Інвестыцыйны кодэкс Рэспублікі Беларусь будзе скасаваны.

За перыяд працы над законапраектам «Аб інвестыцыях» у парламент паступіла больш як 200 прапаноў. Усе яны былі разгледжаны і прыняты да ўвагі. Гэта яшчэ раз даказвае, што змены былі неабходнымі.

**— Ці здарыцца ў Беларусі пасля прыняцца гэтага закона інвестыцыйны бум?**

— Магу амаль дакладна сказаць, што не, хоць гэтага многія і чакаюць. Інвестар — вельмі асцярожны суб'ект, які будзе доўга назіраць і прыцэньвацца. Галоўнае, чаго мы хочам дасягнуць на сучасным этапе — перадаць інвестарам упэўненасць, што іх ніхто не падмане. Дзяржава будзе гуляць з імі на роўных.

Інвестыцыі нам зараз вельмі патрэбны. Узяць тую ж энергетыку — мы будуем атамную электрастанцыю, аднак не забываем і пра альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. Далёка ў гэтым плане пайшлі немцы, фіны, і мы з радасцю пабачылі б замежных інвестараў з іх тэхналогіямі і капіталамі тут.

Упэўнена скажу, што ні адтоку, ні вялікага наплыву замежных інвестараў чакаць не прыходзіцца. Будзе роўнае і планавае развіццё. Аднак зараз ніводны інвестар не зможа сказаць: «Вось я ў Беларусь бы пайшоў бы, але там заканадаўчай базы няма, няма ніякіх гарантый». Гарантыі ёсць. Прыходзьце, укладвайце грошы і атрымлівайце прыбытак.

**— Яшчэ адзін законапраект датычыцца бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці. Будучы Закон аблегчыць альбо, наадварот, ускладніць працу бухгалтараў?**

— Мэта праекта Закона «Аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці» — прывядзенне нашых правіл працы бухгалтараў да міжнародных стандартаў. Законапраект разглядаўся два гады, і новаму складу Нацыянальнага сходу дастаўся «ў спадчыну», здавалася б, у амаль гатовым выглядзе. Аднак папрацаваць усё адно прыйшлося, былі праведзены «круглыя сталы» па збліжэнні айчыннага заканадаўства з міжнародным, рабочая група 14 разоў збіралася абмяркоўваць будучы закон. На гэтыя мерапрыемствы запрашалі прадстаўнікоў самых розных кампаній, як дзяржаўных, так і прыватных. Вынікам стане тое, што нашы бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць будуць зразумелыя эканамістам усіх замежных краін.

Усе меры, закладзеныя ў аснову законапраекта, маюць сваёй канчатковай мэтай стварэнне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату ў краіне.

Калі казаць пра аб'ём працы, то, магчыма, недзе бухгалтарам давядзецца і больш папрацаваць, але агульная колькасць дакументаў не вырасце. Важна, каб яны самі разумелі, што гэта не проста па жаданні Нацыянальнага сходу робіцца, прыняцце такога закону — неабходны зараз захад. У нас няма іншага выйсця, бо так ужо даўно працуе ўвесь свет.

**— Чым было выклікана прыняцце Закона «Аб аўдытарскай дзейнасці»?**

— Усё тым жа жаданнем прывесці беларускае заканадаўства ў гармонію з міжнароднымі стандартамі. Зацікаўленыя асобы (уласнікі, інвестары) на падставе меркавання аўдытара змогуць рабіць карэктныя высновы аб выніках гаспадарчай дзейнасці, фінансавым становішчы прадпрыемства і на гэтай падставе прымаць эканамічныя рашэнні. Гэта будзе забяспечваць новы закон.

**— Я так разумею, што гэтыя тры законапраекты фактычна маюць адну вялікую галоўную мэту: прывесці беларускую прававую базу да сусветных стандартаў. Але на каго мы ўсё-такі больш арыентуемся ў гэтым працэсе: на краіны Мытнага саюза альбо на краіны ЕС?**

— Безумоўна, у першую чаргу на краіны Мытнага саюза. Зараз, як вы ведаеце, мы запрашаем далучыцца да Мытнага саюза і іншыя краіны, напрыклад, Украіну. Спадзяюся, яны ўжо бачаць пазітыўныя бакі такога фармату супрацоўніцтва. Аднак яшчэ раз падкрэслю: новыя беларускія стандарты будуць зразумелымі зацікаўленым асобам як з усходу, так і з захаду. Дарэчы, сюды ж можна аднесці і законапраект «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон «Аб свабодных эканамічных зонах». Гэтыя змены, па-першае, ураўнуюць прынцыпы працы СЭЗ у Беларусі (такім чынам, свабодная эканамічная зона, напрыклад, у Мінскай вобласці не будзе адрозніваца ад свайго аналага ў Гомелі ці Магілёве), а па-другое, зноў-такі дапамогуць наладжваць працу СЭЗ згодна з міжнароднымі стандартамі.

**Інвестыцыі нам зараз вельмі патрэбны. Узяць тую ж энергетыку — мы будуем атамную электрастанцыю, аднак не забываем і пра альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. Далёка ў гэтым плане пайшлі немцы, фіны, і мы з радасцю пабачылі б замежных інвестараў з іх тэхналогіямі і капіталамі тут.**

**— Таксама былі ўнесены змены і дапаўненні ў Закон «Аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі». Як гэтыя змены адаб'юцца на абывацелях? Ці зменіцца сам працэс абмену валюты?**

— Не, тут баяцца нічога не трэба. У сістэме работы абменных пунктаў для шараговых грамадзян нічога не памяняецца. Змены датычацца так званай «папяровай працы» банкаў, нашых мытных адносін, кваліфікацыі валютных аперацый. Усе яны праводзіліся з падачы кіраўніцтва Нацыянальнага банка і звязаны са зменамі і дапаўненнямі, што былі ўнесены ў Банкаўскі кодэкс.

Зноў-такі, вялікую ролю тут адыграла жаданне прывесці закон у адпаведнасць з міжнароднымі актамі, а таксама актамі Прэзідэнта.

**— Змены ўносіліся і ў некаторыя законы па пытаннях іпатэкі. Наколькі мне вядома, іпатэка ў нас не працуе. У чым праблема, і ці вырашыцца яна з прыняццем паправак?**

— Не згодны, іпатэка ў Беларусі працуе. Але праблемы, сапраўды, ёсць: існуе шмат неадпаведнасцяў паміж законамі, што датычацца іпатэкі, і іншымі заканадаўчымі актамі. Законапраект удакладняе нормы Гаспадарчага і Грамадзянскага працэсуальных кодэксаў Беларусі і Закона «Аб іпатэцы». Таксама ён вырашае пытанні закладу маёмасці.

Мы чакаем ажыўлення працэсу іпатэчнага крэдытавання. Цяперашнія змены прывядуць усё да агульнага назоўніка і прыбяруць усе няроўнасці і нестыкоўкі.

**— Як вы ацэньваеце выкананне бюджэту за 2012 год?**

— Заўвагі па яго выкананні былі, асабліва з боку Камітэта дзяржаўнага кантролю. Акрамя таго, бюджэт быў выкананы з нязначным, але дэфіцытам у 0,7 трыльёна рублёў. Галоўная наша задача зараз — вывучыць усе памылкі, дапушчаныя пры яго рэалізацыі, і не дапусціць іх пры выкананні бюджэтаў 2013-га і 2014 гадоў.

Пры гэтым у 2012 годзе мы дасягнулі станоўчага сальда знешняга гандлю, павялічыліся рэальныя прыбыткі насельніцтва ў параўнанні з 2011 годам, павялічыўся аб'ём рознічнага тавараабароту, узрасла рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, стабілізаваўся абменны курс беларускага рубля. Гэтыя і многія іншыя моманты дазваляюць станоўча ацэньваць агульнае выкананне бюджэту.

**— Ці адбілася дэмаграфічная сітуацыя Беларусі (старэнне насельніцтва) на выкананні бюджэту пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва?**

— Некаторая асцярога на гэты конт у нас ёсць, але летась усё выконвалася нармальна, нават з прафіцытам у 0,77 трыльёна рублёў. Некаторыя сумненні можа выклікаць тое, што бюджэт карэктаваўся ў большы бок, але на тое былі свае падставы, бо за год 4 разы павышаўся ўзровень пенсій і дапамог. Таму я лічу гэтыя карэкціроўкі абсалютна абгрунтаванымі.

Усе выплаты па гэтым бюджэце былі зроблены ў належныя тэрміны, а таму пенсіі і матэрыяльныя дапамогі знайшлі сваіх уладальнікаў. Былі зафіксаваны разавыя скаргі, але пра нейкае сістэматычнае парушэнне тэрмінаў ні ў якім разе гаварыць не прыходзіцца. А таму і ацэнка выкананню гэтага бюджэту выключна станоўчая.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НА ДРУГАСНЫМ РЫНКУ ЖЫЛЛЯ ЎЗЛЯЦЕЛІ ЦЭНЫ

**Сярэдні кошт 1 кв. м у чэрвені 2013 года на другасным рынку жылой нерухомасці Мінска стаў самым высокім за апошнія чатыры гады і склаў $1512 у кватэрах тыпавых спажывецкіх якасцяў, без мэблі і папярэдняга рамонту. Пра гэта паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела кансалтынгу і аналітыкі групы кампаній «Твая сталіца» Андрэй Астрэйка.**

Паводле слоў спецыяліста, у чэрвені гэтага года сярэдняя цана 1 кв. м у аднапакаёвых кватэрах дасягнула паказчыка $1626, двухпакаёвых — $1430, трохпакаёвых — $1387. «І хоць сярэдняя цана здзелак у чэрвені ў параўнанні з папярэднім месяцам вырасла нязначна — усяго на 1,2%, чэрвеньскі паказчык сярэдняга кошту 1 кв. м гэтай катэгорыі кватэр стаў рэкордным за апошнія чатыры гады», — патлумачыў Андрэй Астрэйка.

Начальнік аддзела паведаміў, што кватэры з мэбляй або папярэднім рамонтам рэалізоўваліся ў чэрвені гэтага года ў сярэднім даражэй на $200—300 за 1 кв. м, чым кватэры тыпавых спажывецкіх якасцяў. Кошт такіх кватэр у апошнія тры месяцы даволі стабільны і знаходзіцца на ўзроўні $1,7—1,8 тыс. за 1кв. м, дадаў спецыяліст.

Што датычыцца рынку арэнды жылой нерухомасці беларускай сталіцы, то, паводле інфармацыі Андрэя Астрэйкі, значных змяненняў з пачатку года не адбылося. «Сярэдні кошт арэнды аднапакаёвай кватэры ў чэрвені 2013-га склаў $337, двух- і трохпакаёвай — $398 і $428 адпаведна. У сегменце трохпакаёвых кватэр за апошнія паўгода цана арэнды не змянілася, а вось арэнда аднапакаёвых кватэр у другім квартале 2013 года ў параўнанні са студзенем падаражэла амаль на 7%», — адзначыў прадстаўнік кампаніі «Твая сталіца».

## «САМЫ ЛЕПШЫ»? ПАЦВЕРДЗІ ДАКУМЕНТАЛЬНА

**Пры правядзенні рэкламнай акцыі ў Магілёве рэкламадаўца — уладальнік сеткі крам — арганізаваў распаўсюджванне рэкламных лістовак, якія змяшчалі словы ў найвышэйшай ступені «мы прадаем найлепшую садавіну і гародніну», «мы прапануем вам найлепшыя цэны на тавары, што найлепш прадаюцца», «мы гарантуем самы лепшы сэрвіс».**

Аднак пацвердзіць дакументальна правамоцнасць выкарыстання гэтых слоў у рэкламе рэкламадаўца не змог, што з'яўляецца парушэннем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе». Таксама не змог прад'явіць такія дакументы і іншы рэкламадаўца — інтэрнэт-крама па продажы запчастак для аўтамабіляў. На яе сайце распаўсюджвалася рэклама з выкарыстаннем слоў у найвышэйшай ступені і іншых слоў, што стваралі ўражанне аб перавагах тавару, паслуг перад іншымі таварамі і паслугамі. Тут жа змяшчалася параўнанне таго тавару, які рэкламаваўся, з таварамі ад іншых арганізацый: «вы можаце замовіць і набыць аўтазапчасткі па найлепшых цэнах», «самыя лепшыя аўтазапчасткі на нямецкія аўтамабілі», «асартыментны шэраг нашай інтэрнэт-крамы пакрывае ўсе аўтамабільныя сістэмы на ўсе маркі і мадэлі аўтамабіля ад балта да акумулятара на любую машыну», «вы можаце купіць арыгінальныя аўтазапчасткі даных аўтамабільных марак больш танна, чым у афіцыйных дылераў у Беларусі».

Рэклама, якая змяшчае параўнанне тавару з таварамі іншых арганізацый, не дапускаецца, паколькі лічыцца неэтычнай, канстатавалі ў Міністэрстве гандлю. У дачыненні да вышэйназваных рэкламадаўцаў складзены і накіраваны ў суды пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ ЦЭНЫ НА ЦУКАР, ХЛЕБ І МОЦНЫ АЛКАГОЛЬ

**Пра гэта стала вядома з пастаноў Міністэрства эканомікі Беларусі № 48, №49 і №50 ад 4 ліпеня 2013, афіцыйна апублікаваных учора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Гранічныя максімальныя адпускныя цэны па рэгуляваных групах хлеба і хлебабулачных вырабаў павялічацца з сённяшняга дня ў сярэднім на 10%. Так, гранічная максімальная адпускная цана на хлеб жытні, з сумесі жытняй і пшанічнай мукі (акрамя заварных гатункаў) без дадатковай сыравіны ўстаноўлена ў памеры 2576 рублёў за 1 кг; на хлеб жытні, з сумесі жытняй і пшанічнай мукі, заварной без дадатковай сыравіны — 3283 рублі за 1 кг; батоны і перапечкі з пшанічнай мукі вышэйшага гатунку з колькасцю па рэцэптуры цукру і тлушчаў у суме не вышэй за 14% вагой 300 г і больш — 4961 рубель за 1 кг; на батоны і перапечкі з пшанічнай мукі першага гатунку з утрыманнем па рэцэптуры цукру і тлушчаў у суме не вышэй за 14% вагой 300 г і больш — 4315 рублёў за 1 кг. Міністэрства эканомікі сцвярджае, што такое рашэнне прынята «з улікам прапаноў Мінсельгасхарча, у мэтах кампенсацыі падаражэння сыравіны».

Гранічныя максімальныя рознічныя цэны, якія рэгулююцца, на віды цукру-пяску белага без дабавак павялічаны ў сярэднім на 5%. Так, гранічныя максімальныя рознічныя цэны на цукар-пясок белы без дабавак вагавы, упакаваны ў мяшкі ад 25 да 50 кг, вызначаны ў памеры 7900 рублёў за 1 кг; на цукар-пясок белы без дабавак вагавы, упакаваны ў мяшкі ад 2 да 25 кг, — 8400 рублёў за 1 кг; на цукар-пясок белы без дабавак, расфасаваны ў спажывецкую ўпакоўку аб'ёмам ад 500 г да 1 кг, — таксама ў памеры 8400 рублёў за 1 кг. У Міністэрстве эканомікі тлумачаць, што такое рашэнне прынята «з улікам прапаноў канцэрна «Белдзяржхарчпрам», для стабілізацыі фінансавага стану цукраперапрацоўчых арганізацый».

Павышаюцца таксама гранічныя мінімальныя цэны на алкагольную прадукцыю мацункам звыш 28%. Гранічная мінімальная адпускная цана на алкаголь мацункам 40% за 0,5 л павялічана на 25,6% да 27 тысяч рублёў, гранічная мінімальная рознічная цана (з ПДВ) — на 28,4% да 38 тысяч рублёў. Гранічная мінімальная адпускная цана на імпартны алкаголь мацункам 40% павышана на 25,6% — да 54 тысяч рублёў. У Міністэрстве эканомікі патлумачылі, што гэтае рашэнне прынята «ў сувязі з ростам ставак акцызаў». «З увядзеннем у дзеянне ўказанай пастановы вытворцы і імпарцёры алкагольнай прадукцыі, а таксама гандлёвыя арганізацыі павінны рэалізоўваць алкагольную прадукцыю мацункам звыш 28% па цэнах, не ніжэй за ўстаноўленыя», — адзначылі ў міністэрстве.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## НА МІНСКІХ МОГІЛКАХ ПЛАНУЮЦЬ УСТАНАВІЦЬ ЭЛЕКТРОННЫЯ ТЭРМІНАЛЫ

**Электронныя інфармацыйныя тэрміналы, з дапамогай якіх можна атрымаць звесткі пра пахаваных, плануюць усталяваць на 4 сталічных могілках.**

Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» паведаміў дырэктар спецкамбіната КБА Мікалай Ракевіч.

У прыватнасці, тэрміналы павінны з'явіцца на Кальварыйскіх могілках, а таксама могілках «Чыжоўскія», «Паўночныя» і «Міханавічы». Канкрэтных тэрмінаў рэалізацыі гэтага праекта дырэктар спецкамбіната КБА пакуль не называе: усё залежыць ад фінансавага складніка.

Заўважым, электронныя інфармацыйныя тэрміналы на сталічных некропалях выкарыстоўваюцца з 2008 года. Імі ўжо абсталяваны могілкі «Усходнія», «Вайсковыя», «Заходнія» і «Калодзішчы». Тэхнічныя сродкі ўсталяваны і падтрымліваюцца за кошт уласнага прыбытку спецкамбіната КБА і распрацоўшчыка.

З дапамогай электроннага тэрмінала можна знайсці прозвішча, імя і імя па бацьку нябожчыка, дату яго нараджэння і смерці, а таксама нумар участка, рада і магілы, дзе ён пахаваны.

**«Мінск—Навіны».**

## ЯК УЮН НА ПАТЭЛЬНІ...

**На рацэ Дабысна паблізу вёскі Вялікія Рогі работнікі Жлобінскай міжрайінспекцыі затрымалі мясцовага жыхара, які пры дапамозе электралавільнага прыстасавання незаконна здабыў 156 асобін розных відаў рыбы агульнай вагой 27 кілаграмаў.**

Шкода навакольнаму асяроддзю нанесена ў асабліва буйным памеры — 86,4 мільёна рублёў (864 базавыя велічыні), паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Пры затрыманні парушальнік утапіў электралавільнае прыстасаванне, спрабаваў пазбавіцца ад незаконна здабытай рыбы і ўцячы. За непадпарадкаванне законным патрабаванням дзяржінспектараў пры выкананні імі службовых абавязкаў у дачыненні да грамадзяніна распачаты адміністрацыйны працэс. Таксама вядома, што парушальнік дзейнічаў не адзін. Асоба яго памагатага зараз высвятляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Ў сталіцы працуюць добраахвотніцкія атрады, якія бескарысліва дапамагаюць у добраўпарадкаванні горада. Старшакласнікі і студэнты працуюць на розных аб'ектах. Праца кіпіць на тэрыторыі храма-помніка ў гонар Усіх Святых — гэта першы і пакуль адзіны ў краіне храм-мемарыял.

Паводле слоў дырэктара беларускага культурнага цэнтра «Духоўнае адраджэнне» Веры Сірачовай, будаўніцтва храма ўжо падыходзіць да завяршэння. — Праз тры-чатыры месяцы работы будуць скончаныя, менавіта таму дапамога добраахвотніцкіх атрадаў вельмі важная, — распавяла Вера Уладзіміраўна. — Хлопцы і дзяўчаты прыбіраюць тэрыторыю ад будаўнічага смецця, сочаць за вялікай зялёнай зонай, мыюць вокны...

Перад працай — абавязковая экскурсія па храме-помніку. Лепшыя добраахвотніцкія атрады будуць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі.

Марына БЕГУНКОВА,
фота аўтара.

# ЧАС ПРАЦАВАЦЬ







Павел ЛАЗОВІК:

# «ЖУРНАЛІСТ — ГЭТА АКЦЁР, ЯКІ СТВАРАЕ НАСТРОЙ І АТМАСФЕРУ Ў ЭФІРЫ»

**Каментатар дзіцячага «Еўрабачання», «Грэмі», «Оскара», вядучы радыё і тэлебачання Павел Лазовік у прадстаўленні не мае патрэбы. Яго голас знаёмы многім. Аднак сакрэт поспеху не толькі ў гэтым. Пасля гутаркі з Паўлам можна вывесці наступную формулу: трэба вучыцца ў прафесіяналаў, праяўляць актыўнасць у эфіры і ў жыцці, няспынна самаўдасканальвацца. Не здзіўляйцеся, калі аднойчы сустрэнеце яго на борце самалёта альбо пачуеце, што ён адкрывае кавярню. Але гэта ў перспектыве, а пакуль што мы размаўляем з ім пра «непрабіўных гасцей», сяброўства па-за эфірам і падарожжы, якія натхняюць на працу.**



**— Вы працуеце на Першым нацыянальным канале беларускага радыё і Радыус-ФМ. Сумесна з тэлеканалам «Беларусь 24» выпускаеце праект «Актуальны мікрафон». Складана сумяшчаць працу на радыё і тэлебачанні?**

— Тое, што ў структуры Белтэлерадыёкампаніі існуюць розныя падраздзяленні, дае больш магчымасцяў рэалізоўваць сябе. Як я паспяваю? Тут, мабыць, сакрэт просты: як любы чалавек, які працуе і цэніць свой час, я планую справы на дзень, на тыдзень і нават на месяц наперад. Калі ўдаецца зрабіць расклад, то ведаеш, калі і што трэба паспець. Журналістыка для мяне і праца, і хобі, я займаюся ёю штодзённа з задавальненнем і дзялюся гэтым са сваёй аўдыторыяй.

**— А самі вы прыхільнік якога спосабу атрымання інфармацыі?**

— Зыходзячы з патрабаванняў прафесіі быць у курсе падзей, з раніцы заходжу ў інтэрнэт, чытаю навіны. Але, калі б я не быў журналістам і ацэньваў іх з пазіцыі звычайнага карыстальніка, то я глядзеў бы тэлевізар, а інтэрнэт мяне цікавіў бы ў меншай меры. З газет сёння хочацца атрымліваць аналітыку, бо навін хапае ў сеціве. Мне здаецца, што газеты маглі б заставацца цікавымі пры падачы матэрыялаў на «часопісны» манер.

**— Праўда, што вы марылі быць урачом?**

— Урачом хацелася быць па сутнасці. У тым сэнсе, што змагу рабіць людзей больш радаснымі. Як тыя, хто марыць стаць настаўнікам, жадаюць «узгадоўваць» дзіцячыя душы і напаўняць іх ведамі. А наогул я баюся ўрачоў і наведаць доктара для мяне — справа не з лёгкіх. У гады майго юнацтва прафесію выбіралі па прынцыпе: «куды лягчэй паступіць». І пажадана, каб бліжэй да дома. Я родам з Маладзечна. І аднойчы здарылася так, што мы з аднакласніцай, з якой былі суседзямі па парце, паехалі на Дзень адчыненых дзвярэй у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Там сярод россыпу факультэтаў маю ўвагу прыцягнуў журфак. Тады падумаў: «А я ж яшчэ і школьнай газетай займаўся». Вырашыў здаваць іспыты.

**— Пайшлі шляхам найменшага супраціўлення?**

— Можна і так сказаць. Ні ў мяне, ні ў бацькоў не было жадання, каб я стаў журналістам. Ніхто з родных не мае дачынення да прафесіі. Я з простай сям'і, дзе тата і мама — завадскія працаўнікі. Яны часцей думалі пра такую адукацыю для мяне, якая была б прэстыжнай і прыносіла грошы. Таму складана патлумачыць, адкуль цяга да журналістыкі. Мабыць, прычынай усяму мае захапленне лялечным тэатрам у школьныя гады. Там была сцэна, камунікацыя і магчымасць распрацоўваць у сабе акцёрскае майстэрства. Потым — насценгазета, дзе збіраў і пісаў матэрыялы — «руку» трэніраваў. Так склалася само сабой.

**— А прымяраць на сябе прафесію акцёра не спрабавалі?**

— Акцёрам я, мабыць, не стаў бы. Вось зараз думаю, як цудоўна, што ўсё атрымалася з журналістыкай, бо журналіст — ён жа і акцёр, проста наша сцэна — эфір. Там, як і ў тэатры, мы не толькі іграем, а і праз сябе прапускаем эмоцыі, перажываем сітуацыі. Пасля праграмы ты ходзіш выціснуты, як лімон, таму што сілы і эмоцыі пайшлі на тое, каб данесці да свайго слухача неабходную інфармацыю.

**— Ваш голас і ўменне імправізаваць забяспечваюць поспех у эфіры...**

— Голас для таго і дадзены, каб заахвочваць слухача і запамінацца яму. Усё сумнае, манатоннае — гэта толькі загатоўкі. Яны — аснова, якая журналістам-пачаткоўцам дапамагае не хваляваца, а вопытных можа вырātаваць у выпадку, калі раптам госць эфіру пападзецца нешматслоўны. Праграму ж не адменіш. А імправізацыя дапамагае. Ваш госць, незалежна ад свайго сацыяльнага становішча, павінен адчуваць сябе так, нібы вы сябры, якія сустрэліся ў кавярні. Вы размаўляеце, і вас цікавіць усё, што ён вам расказвае. Калі такая шчырая зацікаўленасць праяўляецца ў эфіры, то і слухачам будзе цікавы ваш суразмоўца. Уменне імправізаваць — гэта дар, які з'яўляецца з часам, пры ўмове, што будзеш назіральным і здолееш у чалавеку выклікаць сімпатыю, каб ён пачуваў сябе свабодна і камфортна.

**Журналіст — ён жа і акцёр, проста наша сцэна — эфір. Там, як і ў тэатры, мы не толькі іграем, а і праз сябе прапускаем эмоцыі, перажываем сітуацыі.**

**— Як «настройваеце» сваіх гасцей перад эфірам?**

— Перш за ўсё праяўляючы сваю зацікаўленасць. Журналіст павінен умець здзіўляцца. Пастаў сябе на месца госця і зразумей, чым ён асаблівы. Часам у мяне спрабуюць даведацца, якія пытанні будуць, а я не ведаю, бо можна скласці спіс не з аднаго дзясятка пытанняў, а пачнецца размова, і кірунак гутаркі зменіцца пасля першага адказу. Прадказаць немагчыма. Здараецца, што трапляюцца і «складаныя», нешматслоўныя суразмоўцы. Журналіст, незалежна ад таго, працуе ён на радыё ці на тэлебачанні, павінен быць добрым псіхолагам. Увогуле, настройваць гасцей пачынаю яшчэ задоўга да эфіру, калі тэлефаную і запрашаю іх на праграму, калі сустракаю ў фае. Усе гэтыя, здавалася б, дробязі ўплываюць на камфорт чалавека, які потым дае інфармацыю. Бывае, што аказваешся з госцем у эфіры і разумееш — бяда! Адказаў не дабіцца ці яны зводзяцца да «так» і «не», і паўзы даводзіцца нечым запаўняць. Здараецца, чалавек да эфіру шмат цікавага расказвае, а перад мікрафонам губляецца і ледзьве словы прамаўляе.

**— У памяці яшчэ застаўся першы выхад у эфір?**

— Вільготныя далоні, «сухое» горла, трымценне рук — усё было. Той стан нельга ні з чым параўнаць. Ён не падобны на той, калі ты сядзіш на экзамене ці пад дзвярыма зубнога ўрача альбо вяртаешся дадому цёмнай ноччу. Здаецца, такога выкіду адрэналіну і такога напружання я не адчуваў больш ніколі ў жыцці. Існуе і псіхалагічная сцяна, бо ты разумееш, што зараз павінен нешта рабіць. Нельга сказаць, быццам з часам страх знікае, проста адчуванні становяцца «адпрацаванымі», і ты ўжо не звяртаеш увагі на хваляванне.

**— Сустрэчы на працы перарастаюць у сяброўства ў жыцці?**

— Працягваць сяброўства даводзіцца з практычнага пункту гледжання: калі ты ў эфіры кожны дзень, то заўсёды ёсць неабходнасць у людзях, якія змогуць выручыць цябе па першым званку. І такія сувязі вырастаюць менавіта з першых сустрэч у працоўным фармаце. Таксама ёсць людзі, якія прыходзяць на праграму, а потым проста падтрымліваюць з табой сувязь, цікавяцца тваім жыццём па-за эфірнай прасторай.

**— З чаго складаецца ваша жыццё па-за працай?**

— Перш за ўсё імкнуся знайсці час для сну, бо праца адбірае шмат часу. Калі эфіры раніцай, то а пятай гадзіне мяне ўжо забірае службовая машына. І я павінен быць бадзёрым. Начныя эфіры заканчваюцца ў дзве, а то і ў тры гадзіны ночы. Таму катэгорыі «сава» — «жаваранак» дакладна не пра нас. А так мне падабаецца падарожнічаць. Люблю адкрываць новыя гарады, вывучаць гісторыю, культуру іншых краін, знаёміцца з новымі людзьмі. Прычым гэта дае і добрую загатоўку для працы. Бо пры жаданні кожны дзень быць цікавым, новыя веды і ўражанні здольны дапамагчы. Калі ж у тваім жыцці толькі маршрут «дом—праца—дом», то хутка можна выдыхнуцца, нават валодаючы нейкімі геніяльнымі думкамі і ідэямі.

**З газет сёння хочацца атрымліваць аналітыку, бо навін хапае ў сеціве.**

**— Ваша праграма «Адкрытая пляцоўка» на радыё існуе не адзін год, як удаецца зацікавіць моладзь?**

— «Адкрытая пляцоўка» — адзін з першых штодзённых праектаў прамога эфіру. Праграме больш за дванаццаць гадоў. Тэрмін не малы і сведчыць пра тое, што яе ведаюць, яна патрэбна. Там я прайшоў сваю школу станаўлення як журналіст і вядучы прамога эфіру. Роўны вучыў роўнага, бо на той час я быў якраз прадстаўніком моладзі. Зараз мы пасталелі, але ў душы імкнёмся заставацца маладымі. Сёння рабіць праграму для моладзі складана. Дзякуючы таму, што мы існуем не толькі на FM-прасторы, але і анлайн не губляецца зваротная сувязь. І мы па-ранейшаму застаёмся той пляцоўкай, дзе маладыя людзі могуць знайсці карысную інфармацыю і парады.

**Алена ДРАПКО.**

■ Медыяпрастора

## HIGH TECH

| | |
|---|---|
| Брэст | 106.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM |
| Мінск | 107.1 FM |
| Гродна | 104.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM |
| Бабруйск | 103.6 FM |
| Баранавічы | 98.4 FM |
| Салігорск | 104.3 FM |
| Пінск | 103.2 FM |

Калі вам цікава, як заўтра будзе выглядаць ваш смартфон, калі нарэшце чалавецтва дабярэцца да Марса і чым скончыцца бітва iOS і Android, слухайце штодня па буднях у 11.15 і 20.15 у эфіры радыё «Мір» праграму «High Tech».

Вядучы Аляксей Патаповіч падзеліцца інфармацыяй аб беларускай і замежнай прадукцыі на IT-рынках, апошнімі навінамі ў сферы высокіх тэхналогій, жыцця ў сацыяльных сетках і сусветным павуцінні ў цэлым.

Па суботах у 11.30 і 20.30 выходзіць пашыраны выпуск рубрыкі, у якім сабраны ўсе самыя цікавыя навіны за тыдзень. Заставайцеся з намі на хвалях радыё «Мір»!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 15 ЛІПЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00 Камедыя «Жандар з Сен-Трапэ».**
**12.15 Камедыя «Ясь і Яніна».**
**13.20** «Анатоль». Дак. фільм.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
**16.00** «Неверагодная Бенька». Дак. фільм.
**16.40** Усё як трэба!
**17.05 Камедыя «М + Ж».**
**19.20** Спецыяльны рэпартаж АТН.
**20.00 Серыял «Земскі доктар. Працяг».**
**21.00** Панарама.
**21.50** «Славянскі базар у Віцебску-2013». «Без каментарыяў».
**22.00** «Славянскі базар у Віцебску-2013». Урачыстае закрыццё XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску-2013».
**0.20** Дзень спорту.
**0.30** «Зорнае жыццё». «Народжаныя ў чужым целе».

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата».**
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.50, 22.50** Дак. серыял «Будзь у тонусе».
**11.25 Камедыя «Залаты ключык».**
**13.55** «Мікалай Пінігін. Мяне няма». Дак. фільм.
**14.40** Пад грыфам «Вядомыя».
**15.15 Камедыя «Нашы суседзі».**
**16.55, 23.25 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**19.00 Серыял «Людзі Шпака».**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Дзяржаўная мяжа».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.00, 16.00, 23.10** «Мой горад». Лельчыцы.
**8.15, 18.40** «Любоў і жыццё маё...». Дак. фільм.
**8.45** «Чароўная палянка». Навукова-папулярны фільм.
**9.00** «Мядзведзь». Тэлеспектакль Альтэрнатыўнага тэатра.
**10.00, 17.35 «Казка пра Зорнага хлопчыка». Фільм-казка. 1-я серыя.**
**11.05** «Скандаліст, або Пісьмы пра каханне». Дак. фільм.
**11.35** «Бубен і барабан». Дак. фільм
**12.15, 21.00 «Крыж міласэрнасці». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**13.35** «Слуцкія паясы — знакі лёсу». Дак. фільм.
**14.05** «Сакрэтны кінематограф». Дак. фільм «Паветраны бой ... на зямлі».
**14.30** «...Штрых... пункцір...». Дак. фільм.
**15.10** «Дарогі лёсу». Дак. фільм.
**16.15, 22.15** «Грунвальд». Гістарычны тэлефільм. Часткі 1-я і 2-я.
**17.05** «Свет прыроды». Балота Чарнецкі мох.
**19.10** «Вежы Навагрудка». Дак. фільм.
**19.30** «Мікалай Мікалаевіч Яроменка-старэйшы. Пасляслоўе». Дак. фільм.
**20.00** «Святыні беларускай зямлі. Брэсцкая крэпасць». Дак. фільм.
**20.15** «Валерый Рачкоўскі. Лялькі і тэатр». Дак. фільм.
**20.30** Калыханка.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10 Серыял «Жаночы доктар 2».**
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**14.00** «Модны прыгавор».
**15.00** «Валянціна Церашкова. Зорка касмічнага шчасця».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «З Міра ў свет. Гісторыя аднаго зыходу».
**18.50** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Адлюстраванне».**
**22.15 Серыял «Цюдоры».**
**0.25 Дэтэктыў «Фалькон».**
**1.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.20** «Глядзець усім!».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Слова жанчыне». Серыял.**
**12.30** «Джэймі: у пошуках смаку».
**13.00** «Жанчыны XX стагоддзя». «Ані Жырардо. Жыць, каб жыць».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг»: «Мегахіты».
**15.35** «Іншая краіна». «Там, дзе Еўропа сустракаецца з AZіяй».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Пад абаронай».
**18.30** «Падманутыя навукай».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Маст. фільм «Гавань».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.45 «Энігма». Серыял.**

### МІР

**5.00 Серыял «Агонь кахання».**
**6.40 Серыял «Арабела».**
**7.05** «Цік-так».
**7.20** М/с «Смяшарыкі».
**8.30 Серыял «Ёхан ды Мар'я».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10, 3.15 Маст. фільм «Лекі супраць страху».**
**10.50** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.25 Серыял «Суд».**
**14.00** «Злачынствa і пакаранне».
**14.30** «Агульны інтарэс».
**15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**17.00, 23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**18.30, 0.45 Серыял «Закон і парадак».**
**21.25** «Сусветная канапа».
**21.40** «Народжаныя перамагаць».
**22.10** Дзённік Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».
**22.25** XXII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Дзень другі.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоу.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55, 22.35 Серыял «Земскі доктар. Працяг».**
**17.15** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**17.30** Весткі. Дзяжурная часць.
**17.50 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.50 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**20.45 Серыял «Леднікоў».**
**23.45** Фестываль «Славянскі базар-2013».
**1.30 Серыял «Пацалуйце нявесту!».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.55** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**15.05** «Справа густу».
**15.35, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.30 Серыял «Брацэнікі».**
**19.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**21.20 Серыял «Марскія д'ябалы».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30 Серыял «Глухар. Працяг».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 11.55, 18.35, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20** М/с «Ліга справядлівасці».
**7.40, 14.20 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**9.25, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».**
**10.10 «Сінематограф». Маст. фільм «Брадвейская мелодыя».**
**12.00 Фантастыка «Марскі бой».**
**14.05** «Кінаблакнот».
**16.00** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Кампаньёны».**
**18.40 Серыял «Праслушка».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Ганна і кароль».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Жонкі алігархаў».
**10.00 Серыял «Амазонкі».**
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00** «Адны дома».
**12.30** «Куды прыводзяць мары».
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Кадэцтва».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Метад Лаўровай».**
**20.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».**
**21.10 Серыял «Дзетка».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** Раніца з ІНТЭРам.
**9.10 Маст. фільм «Няхай гавораць».**
**10.50, 16.55, 1.35** Сямейны суд.
**11.35, 22.50** Легенды бандыцкай Адэсы.
**12.20, 15.40, 0.35** Дак. серыял «Партрэты дзікай прыроды».
**12.40, 18.30, 5.10 Серыял «Анёл-ахоўнік».**
**13.25, 23.10** Пазавочы.
**14.10** Дак. серыял «Галівудскія пары».
**15.00, 0.55** Судовыя справы.
**16.00** Канцэрт групы «Аквариум».
**17.40, 4.20** Давай пажэнімся!
**19.15, 2.15** Дак. серыял «Месцы сілы».
**20.00, 3.00** Падрабязнасці.
**20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**21.15, 3.30 Серыял «Людзі і цені-2».**
**22.00, 6.00 Серыял «Вяроўка з пяску».**
**0.00** Краіна смяецца.
**0.15** Феерыя падарожжаў.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2009 год.
**6.00 «Капітан». Маст. фільм.**
**6.30** «Свята канікул». 1988 год.
**8.00** «Песня-81». 1 аддзяленне. 1981 год.
**9.00** «Дарагі хлопчык». Тэлеспектакль. 1973 год.
**11.00** «Рана раніцай». 1991 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «На агеньчык». Юбілейны 100-ы выпуск «Блакітнага агеньчыка». 1966 год.
**13.50** «Фестываль у Сан-Рэма». Фільм-канцэрт. 1991 год.
**15.00** «У коле сяброў». Фільм-канцэрт. 1986 год.
**16.30** «Пакуль усе дома». 1994 год.
**17.00** «Марафон-15». 1991 год.
**18.30** «Знак Саламандры». Тэлеспектакль з цыклу «Гэты фантастычны свет». 1984 год.
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Аўтарскі вечар Андрэя Дзяменцьева». 1983 год.
**23.05** «Давайце пазнаёмімся». Тэлемост Вярхоўны Савет СССР — Кангрэс ЗША. 1987 год.
**0.30** «Тэатр». Маст. фільм.
**1.45** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**4.00** «Кінапанарама». 1981 год. 1-я частка.

### EUROSPORT

**9.00, 12.45, 14.00** Універсіяда.
**10.45** Прыгодніцкі часопіс. Ultra trail.
**11.15, 16.00, 0.00** Веласпорт. Тур дэ Франс.
**17.45, 21.00, 1.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**23.30** Коннаспартыўны часопіс.
**23.45** Вось гэта дзіва!!!
**23.55** Sport Excellence.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 2.20** Серыял «Страх, стрэс і злосць».
**6.15** Камедыя «Алмазны сабака».
**8.00, 12.55, 16.10** Серыял «Прападобны».
**9.00** Камедыя «Кур'ер».
**10.40, 16.45, 23.50** «Камедыянты. Лепшае».
**11.15** Камедыя «Мільёны Брустэра».
**14.10** Меладрама «Зоймемся любоўю».
**17.20** Камедыя «Кароль вечарынак».
**19.20** Камедыя «Арлет».
**21.00** Серыял «Маё вялікае грэчаскае жыццё». 1-2 серыя.
**22.10** Камедыя «Аксамітныя ручкі».
**0.10** Меладрама «Прыгажунчык».
**3.25** Камедыя «Гэта нявызначанае пачуццё».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Фільм-казка «Па шчупаковым загадзе».
**3.00, 9.00, 15.00** М/с «Люты Бамбр», фільм 1. Зборнік м/ф «Што на што падобна». «Дзяўчынка і слон». «Першая зіма». «Хто ў лесе гаспадар».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». М/ф «Цудоўны званок». М/ф «Водаправод на агарод».
**5.00, 11.00, 17.00** Маст. фільм «Каштанка». М/ф «Выкрадальнікі фарбаў».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Легенда пра Зора».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Запаветная мара». «Чарадзейная флейта».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00, 3.30** Серыял «Камісар Мегрэ».
**9.00, 18.30, 1.40** Серыял «Фатмагуль».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.30** Анімацыйны фільм «Сезон палявання».
**15.00, 23.00** Серыял «Менталіст».
**20.15** Серыял «Апошняя сустрэча «.
**21.15, 4.15** Маст. фільм «Дзіўныя сваякі».
**23.55** Серыял «Кантынуум».
**0.45** Серыял «Паляўнічыя на чужых».
**5.40** «Тлумачэнне сноў».

### ТБ1000

**5.00, 11.00** Камедыя «Коткі-мышкі».
**7.00** Меладрама «Мае чарнічныя ночы».
**8.45** Трылер «Адлік забойстваў».
**13.00** Меладрама «Міс Пецігру».
**14.40** Баявік «Прывідны гоншчык».
**17.00** Камедыя «Геніяльны тата».
**19.00** Меладрама «Святло вакол».
**21.00** Фільм жахаў «Прывід дома на ўзгорку».
**23.00** Дэтэктыў «У чужым шэрагу».
**1.10** Трылер «Вядзьмарства».
**3.00** Драма «Грынберг».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Мюзікл «Лятучая мыш».
**8.40** Камедыя «Тушыце святло!».
**10.10** Камедыя «Дачка якудзы».
**12.00** Маст. фільм «Піраты XX стагоддзя».
**13.40** Драма «Мішэнь».
**16.20** Камедыя «Праўдзіва разнаскурых».
**18.00** Меладрама «Гувернантка».
**20.00** Камедыя «Мамы».
**22.00** Драма «Каўказская рулетка».
**23.50** Камедыя «Чэлябумбія».
**2.00** Баявік «Выкрадальнікі кніг».
**4.00** Драма «Кармэн».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 0.00** Ліхтугі за мяжой.
**6.00, 10.00** Гіена, царыца драпежнікаў.
**7.00, 15.00** У пошуках акул.
**8.00, 16.00** Скарбашукальнікі.
**9.00, 12.00, 17.00** Аўта-SOS.
**11.00** Горшыя турмы Амерыкі.
**13.00** Вайна генералаў.
**14.00** У аб'ектыве.
**18.00, 2.00** Паляўнічыя на нацыстаў.
**19.00, 3.00** Асабліва строгі рэжым.
**20.00, 23.00, 4.00** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**22.00, 1.00** У пагоні за НЛА.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Золата джунгляў.
**7.50, 12.20, 3.05** Дэмантаж.
**8.40, 20.05** Патрабуецца зборка.
**9.10, 20.35, 4.45** Як працуюць машыны.
**9.35, 15.30, 5.10** Барацьба за ўлоў.
**10.30, 2.15** Чаму?
**11.25, 17.20, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 0.00** Top Gear.
**14.10, 6.05** Новае жыццё рэтра-аўтамабіляў.
**15.05** Махінатары на трасе.
**18.15** Паляўнічыя на рэліквіі.
**19.10** Паляўнічыя на склады.
**21.00** Рыбалка голымі рукамі.
**22.00** Ледзяное золата.
**23.00** Аляска.
**0.55** Монстры ўнутры мяне.
**1.50** Маланкавыя катастрофы.

■ Блізкія людзі

# МІХАІЛ

*(СЛОВЫ ПРА ЖЫВАПІСЦА МІХАІЛА САВІЦКАГА)*

## ЯБЛЫКІ

Валодзя Ісачанка захапіўся творамі Міхаіла Савіцкага. Ён прапанаваў мне пайсці да свайго куміра ў майстэрню і папрасіць дазволу глянуць на новыя карціны, прысвечаныя вязням нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў. Пра карціны хадзіла шмат чутак і легендаў, але мала хто тые палотны бачыў. Ісці да Савіцкага я пагадзіўся. Мы нават прыйшлі пад дзверы майстэрні. Мы нават мастака дачакаліся. Савіцкі з'явіўся з газетным кульком, поўным яблыкаў. Мы павіталіся з майстрам, але акрамя «добры дзень» нічога не сказалі. Пасараміліся. Ісачанка думаў, што я загавару з Савіцкім, а я быў упэўнены, што загаворыць ён. Так мы і не зайшлі ў майстэрню з легендарнымі карцінамі.

## ПАЗНАВАЛЬНАСЦЬ

Угледаючыся ў карціны і ўчытваючыся ў кнігі, ты міжволі шукаеш сябе. Калі ў чужых творах ты пазнаеш свой свет і сябе ў ім, мастак робіцца для цябе блізкім і сваім. Пра адных пісьменнікаў і мастакоў ты можаш сказаць «мой», а пра другіх ты так не кажаш. Міхаіл Савіцкі — мой мастак. Прыйшоўшы ў краязнаўчы музей маляваць чучалы ваўкоў, я спыніўся каля карціны «Добраахвотнікі». На ёй сяляне ў каўпаках і працоўныя ў картузах ды кепках запісваліся ў народнае войска. У адным з працоўных я пазнаў сябе. Каб развеяць сумневы, я паклікаў аднакурсніка Гену Чэха, які таксама маляваў чучалы жаўтавокіх ваўкоў. У вобразе працоўнага ў чорнай кепцы Чэх мяне прызнаў. З палатна «Добраахвотнікі» я глядзеў сам на сябе. Раней на палатне я быў крыху старэйшы за сябе рэальнага, а цяпер я там значна маладзейшы, але ўсё яшчэ падобны, усё яшчэ пазнавальны.

## ЗАКАЗ

Савіцкі заўсёды быў дзяржаўным мастаком на ўсе сто працэнтаў. Дзяржава стварала яго, а ён ствараў палотны на дзяржаўную замову і гэтымі творамі ўслаўляў дзяржаву. Выключэннем могуць паслужыць некалькі ранніх партрэтаў сына і жонкі, але яны, як і ўсе выключэнні адно падкрэсляць правіла. У творчасці Савіцкага мне падабаюцца якраз выключэнні — «Дзяўчына з капустай», «Льнаводы» і два палотны з аднолькавай назвай «Рыта і Андрэй».

## ІМЯ

Савіцкі не любіў, калі нехта называў яго Міхасём. Ён настойваў на тым, што яго імя менавіта Міхаіл, а не Міхась ці Міхал. За публічнае згадванне Савіцкага як Міхала ці Міхася ён крыўдаваў. Добра, што ніхто ніколі не назваў яго Мішэль, бо такую вульгарнасць Міхаіл Андрэевіч не дараваў бы ніколі.

## МУЖЧЫНСКІЯ ЗАБАЎКІ

Набралі мы таннага віна. Селі пад вербамі, каля самай рэчкі. Выпіваем і гаворым пра мужчынскія забаўкі... «Не так шмат у нас забавак!» — кажа мне выкладчык жывапісу Кім. «Ня так і шмат!» — пагаджаюся з выкладчыкам. «Якія ў нас забаўкі? Памаляваць ды выпіць? Ты яшчэ да якой дзеўкі сходзіш. Вы яшчэ пакурыце пад кустом бэзу... Усё». — «Ёсць яшчэ рыбакі. Ім ні чарка, ні цыгарэта не трэба. Іх нават дзеўка не натхняе. Бяруць вуду і стаяць гадзінамі каля вады». — «Савіцкі такі. Усё студэнты — гуляць-выпіваць, а ён з вудаю каля рэчкі ходзіць. Усю дыпломную практыку, дзень у дзень, і раніцай, і ўвечары прасядзеў каля рэчкі». — «Дысцыплінаваны». — «Не кажы! А ў майго таварыша, у Васіля, самая смешная забаўка! Ён і не п'е і не курыць, і рыбу не ловіць, і ў грыбы не ходзіць... Ён сварыцца з жонкаю. Сварыцца так, што яны ажно разыходзяцца, потым сыходзяцца, потым зноў разбягаюцца ды збягаюцца. І слёзы, і лямант, і крыкі з праклёнамі... Не разумею людзей з такімі дурнымі забаўкамі. Лепей сядзець пад вярбою і віно піць. Праўда?» — «Лепей». — пагаджаюся з выкладчыкам і разліваю вермут па шклянках.

## ПОСТМАДЭРНІЗМ

Вінцэнт Ван Гог сваім жыццём і ўсёй творчасцю давёў, што дзяржаўны заказ не з'яўляецца першасным для мастака. Пасля Ван Гога ўсе карціны, напісаныя для дзяржавы і на замову, выглядаюць халтурай. Нават замовы з царквы глядзяцца працай дзеля заробкаў, а не творчасцю дзеля спасціжэння законаў светабудовы. Таму палотны мастака Савіцкага варта разглядаць у кантэксце гісторыі савецкай імперыі. Пераканаў, што адбудзецца перагляд адзнак, якія выстаўлялі яму ў свой час арткрытыкі і мастацтвазнаўцы. Савіцкі будзе залічаны ў шэрагі постмадэрністаў, якія старанна пераймалі ўзоры вялікіх папярэднікаў. Міхаіл Савіцкі пісаў імправізацыі на тэмы, знойдзеныя Казімірам Малевічам — «Сцелюць лён» і «Льнаводы», Кузьмой Пятровым-Водкіным — «Дзяўчына з капустай», Дыега Рыверам — «Клятва» і «Партызанская мадонна», Хасэ Ароска — «У полі», Сальвадорам Далі — «Мадонна Біркенаў», Кэт Кольвіц — «Беларусы» і «Партызаны», як і павінен быў пісаць мастак у ягоным часе.

## АСКЕТЫЗМ

Міхаіл Савіцкі трапіў у палон і не адзін год правёў у канцэнтрацыйным лагеры. Жыццё ваеннапалоннага наклала на Савіцкага незнішчальны адбітак. Ён усе астатнія гады быў у сваіх паводзінах асцярожным і рацыянальным лагерным аскетам. Нават у ежы заставаўся асцярожным. Я бачыў, як пасля працоўнага дня Савіцкі павольна еў алюмініевай лыжкай суп з алюмініевай талеркі. Такія талеркі былі ў школьных сталоўках. Ад зайздросных людзей я чуў, што ў Міхаіла Савіцкага горы залатога і сярэбранага посуду. Таго шыкоўнага посуду я не бачыў. Можа, ён дзе і хаваўся, але дома і ў майстэрні ў мастака было ўсё спрошчана, нават свае ўлюбёныя кнігі і часопісы ён трымаў на самаробных паліцах без шкла.



## ЗАХОПЛЕНАСЦЬ

Не скажу, што я быў пастаянным госцем у майстэрні Міхаіла Савіцкага, але некалькі разоў давялося пасядзець за гасцінным сталом разам з майстрам. Гасціннасць была сціплая — хлеб, гарэлка, піва, салёны агурок і сухаватая хатняя каўбаса. Савіцкі піў піва, а я — гарэлку. Майстар спытаў, чаму я не паступаў на станковы жывапіс, а пайшоў вучыцца на жывапіс манументальны? Мне зусім не падабаліся выкладчыкі на кафедры станкавістаў. Хіба можна было лічыць загадчыка кафедры Крахалёва мастаком? Савіцкі спытаў, ці памятаю я палотны Крахалёва? Я згадаў «Калектывізацыю» — зімовы дзень у вёсцы, пад чырвонымі сцягамі сяляне ў рудых кажухах запісваюцца ў калгас. Савіцкі прадэманстраваў мне свой адметны саркастычны бязгучны смех і сказаў, што карціна «Калектывізацыя» найлепшая ў Крахалёва, бо яе напісаў не Крахалёў, а ён — Савіцкі. «Зайшоў да яго ў майстэрню. Па-сяброўску. Мы ўсе адзін да аднаго заходзілі па-сяброўску. Узяў пэндзлік, пачаў папраўляць твары, рукі, адзежу... Захапіўся. Вы ж ведаеце, як яно бывае, калі захопішся. Цэлы дзень і пісаў «Калектывізацыю», і напісаў». У апавяданні Савіцкага самым пераканаўчым была згадка пра стан захопленасці. Мастак без такога захаплення — не мастак, творца не творца. У гэтым была праўда Савіцкага, неабвержная.

## СВЯТЫ

Андрэй Савіцкі казаў пра свайго бацьку-мастака, што той працуе, як селянін — без святаў і выхадных. Селянін і сапраўды так працуе, бо ў прыроды няма святаў, у жывёл і раслін няма выхадных. Мастак, калі ён праўдзівы мастак, мусіць працаваць несупынна, а не так, як пралетарыят — са шматлікімі выхаднымі ды шматдзённымі гулянкамі. Зрэшты, дыктатура пралетарыяў і зруйнавалася з-за іх любові да хмельных святаў і доўгатэрміновых гуляў.

## ТРУПЫ

Усё жыццё мастак Савіцкі маляваў трупы. Трупы мужчын пад чырвонымі сцягамі, трупы дзяцей у шэрых пялюшках, трупы салдатаў у залатым жыце, трупы дзяўчат і жанчын, складзеныя для спальвання, трупы... Нават намаляваны Савіцкім Ленін выглядаў трупам, што вярнуўся з пекла. На большасці палотнаў Савіцкага не жывапіс, а трупапіс. Ён і ўражвае.

## ЖАРЭБЧЫК

Сустракаю на праспекце Незалежнасці пейзажыста-натурыста Шкарубу: «Ты чаго без капелюша?» Пытаюся, бо некалькі разоў запар сустракаў Валеру ў чорным шыракаполым капелюшы. «Цёпла... Учора Савіцкага хавалі, і таксама цёпла было. Пра яго можна вялікую кнігу напісаць». — «Пра што пісаць? Мы ж з табою ведаем, што Савіцкі усё даўжэзнае жыццё правыконваў дзяржаўныя замовы. Адны замовы. Замовы і ніякіх іншых думак». — «Так і трэба напісаць пра мастака, які ахвяраваў жыццё дзяржаве. Дарэчы! Савіцкі распавядаў пра жарэбчыка... Не мне, але я дакладна перакажу сутнасць ягоных слоў... Здарылася тое ў вёсцы, калі Савіцкі быў яшчэ маленькім хлопчыкам. Той хлопчык бегаў па лузе разам з маленечкім жарэбчыкам. Жарэбчык быў зусім-зусім маладзенькі. Хлопчык і жарэбчык набегаліся да стомы. Жарэбчык лёг адпачыць пад стог, на залацістую салому. Хлопчык лёг побач з ім. Яны ляжалі спіна да спіны. Яны так ляжалі і глядзелі на неба. Вечарэла. Бралася на холад, але хлопчыку было цёпла побач з жарэбчыкам; і каню было цёпла побач з хлопчыкам... Больш нічога цёплага ў жыцці і не было. Савіцкі так і сказаў, што акрамя таго дня, нічога добрага ў жыцці не бачыў. Калі яго спыталі, чаму не напісаў светлую залатую карціну пра хлопчыка і жарэбчыка? Савіцкі на пытанне адказаў пытаннем. Каму яно трэба — маё, асабістае?» Я развітаўся з Валерам і задумаўся над гісторыяй хлопчыка з жарэбчыкам. На першы погляд, яна вельмі кранальная. Па малюнку гэта выдатны мультыплікацыйны і коміксавы сюжэт. Нешта ў ім ёсць антычнае, нешта кентаўраствальнае, нават манументальнасць ёсць, і разам з гэтым гісторыя не натуральная, не жывая, запазычаная. Хто і як яе сканструяваў — невядома, але да мяне яна прыйшла ўспамінам пра мастака Савіцкага.

## ТАПЧАНЧЫК

У майстэрні Савіцкага стаяў вузенькі тапчан, засланы вясковай дзяружкай. Часам на тым тапчанчыку мастак і начаваў. Калі ён захапляўся працаю над новай карцінай, дык мог і не пайсці дамоў, а колькі гадзін паспаць на мулкім тапчане, нечым падобным да лагерных нараў.

## ВУЧНІ

У Савіцкага было шмат вучняў, больш за чвэрць стагоддзя працавала ягоная акадэмічная майстэрня. Любімымі вучнямі Савіцкага сталі мастакі з першага набору: Валодзя Кожух, Віця Альшэўскі, Саша Ксяндзоў... Усе, хто займаўся ў Савіцкага, так і засталіся ягонымі вучнямі. Нават калі яны дэкларатыўна заяўляюць пра адыход ад эстэтычных каштоўнасцяў настаўніка, як гэта робяць Фелікс Янушкевіч, Рома Заслонаў і Хведар Кашкурэвіч, няўзброеным вокам відаць, наколькі палотны вучняў падобныя да палотнаў настаўніка.

## БЛІЗКІЯ ЛЮДЗІ

Кола блізкіх людзей вакол Савіцкага было досыць спецыфічнае. Адно магу сказаць дакладна, вакол Савіцкага я бачыў шмат вельмі разумных людзей, менавіта разумных, што мяне моцна дзівіла, бо сам я ніколі не падзяляў светагляд гэтага мастака.

## САВІЦКІ І МОЙ ЛЁС

Некалькі разоў Міхаіл Савіцкі мне дапамагаў у лёсавызначальныя моманты жыцця. Некалькі разоў пагаршаў маё і без таго кепскае становішча. Цяпер я стаўлюся да яго постаці нейтральна і захоўваю ўдзячнасць за дабро, зробленае Савіцкім уласна мне.

**Адам ГЛОБУС**

■ Запрашальнік

# Рыцары на Замкавай гары

**Мсціслаў запрашае на традыцыйнае свята сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст». Яно пройдзе 27 і 28 ліпеня ў старажытным горадзе на беларуска-расійскім памежжы.**



Як і заўсёды, удзельнікаў і гасцей свята чакае насычаная праграма. Фэст адкрываецца ўрачыстым шэсцем рыцарскіх клубаў, а потым іх удзельнікі пакажуць сваё майстэрства на турнірах. На Замкавай гары будуць спаборнічаць лучнікі, адбудуцца дзве рыцарскія арміі, клуб «Залатая шпора» наладзіць конную дзею.

Будуць канцэрты і танцы, вогненнае шоу і феерверк. Запрацуе кірмаш і горад майстроў. Арганізатары прапануюць экскурсіі па гістарычных месцах Мсціслаўшчыны і помніках архітэктуры. З навінак праграмы — шоу асілкаў, «Сярэднявечны балаган» і нават гонкі прусакоў.

На большасць мерапрыемстваў трэба будзе набываць квіткі: іх кошт ад 5 да 30 тысяч рублёў, з палавіннай зніжкай для дзяцей да 10 гадоў. Аднак ёсць выгадная прапанова: атрымаць комплексны квіток за 160 тысяч рублёў.

Інфармацыю пра сферу паслуг на «Рыцарскім фэсце» можна ўзяць на сайце Мсціслаўскага райвыканкама. З харчаваннем і начлегам праблем не павінна быць, да таго ж мясцовыя ўлады на час свята робяць добраўпарадкаваную пляцоўку для палатачнага гарадка ў гарадскім парку.

**Ілона ІВАНОВА**

Паритетбанк
www.paritetbank.by

**Консолидированная отчетность ОАО «Паритетбанк» за 2012 год (по НСФО)**

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2013 ГОДА**

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 39,264.7 | 34,711.8 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1, 32 | 342,127.6 | 459,118.4 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 2, 32 | 36,157.1 | 80,022.0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3 | 6,029.3 | 14,609.6 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 4, 32 | 506,687.7 | 455,869.8 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| | Инвестиции в зависимые юридические лица | | 5 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 6, 32 | 16.0 | 44.7 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 7 | 106,084.7 | 80,306.5 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 8 | 4,772.1 | 2,379.3 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 9 | 10,259.6 | 12,877.5 |
| 13 | **ИТОГО активы** | **11** | | **1,051,398.8** | **1,139,939.6** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 10, 32 | 81,602.0 | 132,718.6 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 11 | 26,866.6 | 152,345.1 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 12, 32 | 622,733.2 | 616,991.6 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | 46,662.7 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 13 | 4,530.3 | 6,799.4 |
| 21 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **735,732.1** | **955,517.4** |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 14 | 178,368.4 | 93,368.4 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 15,623.2 | 8,623.2 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 15 | 76,705.9 | 50,482.7 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 16 | 44,969.2 | 31,947.9 |
| 28 | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **315,666.7** | **184,422.2** |
| 29 | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **1,051,398.8** | **1,139,939.6** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ ЗА 2012 ГОД**

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 135,398.1 | 102,367.7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 68,095.5 | 62,451.2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 17, 32 | 67,302.6 | 39,916.5 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 25,517.3 | 14,291.9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 4,796.0 | 3,283.1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 18, 32 | 20,721.3 | 11,008.8 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 19 | 208.4 | 1,209.3 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 20 | 11,831.9 | 8,336.8 |
| 10 | Чистый убыток по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 21, 32 | (290.9) | (25.0) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 22, 32 | 7,850.9 | 4,129.1 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 23, 32 | 17,856.4 | 5,918.5 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 24, 32 | 74,291.3 | 41,938.3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 25, 32 | 10,515.7 | 5,868.6 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 24,971.8 | 14,428.9 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 4,195.4 | 3,257.6 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **20,776.4** | **11,171.3** |
| | Доля в прибыли зависимых юридических лиц | | | - | - |
| | **ИТОГО ПРИБЫЛЬ** | | | **20,776.4** | **11,171.3** |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 14 | 0.62 | 0.36 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | 0.62 | 0.36 |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА ЗА 2012 ГОД**

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2011 года | 3011 | 93,368.4 | - | 4,835.8 | 25,630 | 11,637.5 | 135,471.7 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 3,787.4 | 6,317.9 | 38,845.2 | 48,950.5 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 11,171.3 | 38,845.2 | 50,016.5 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 3,787.4 | (3,787.4) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | (1,066.0) | x | (1,066.0) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | X | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (1,066.0) | x | (1,066.0) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | Прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2012 года | **3013** | **93,368.4** | **-** | **8,623.2** | **31,947.9** | **50,482.7** | **184,422.2** |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2012 года | 3011 | 93,368.4 | - | 8,623.2 | 31,947.9 | 50,482.7 | 184,422.2 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 85,000.0 | - | 7,000.0 | 13,021.3 | 26,223.2 | 131,244.5 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 20,776.4 | 26,223.2 | 46,999.6 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 7,000.0 | (7,000) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 85,000.0 | - | x | (755.1) | x | 84,244.9 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 85,000.0 | - | x | x | x | 85,000.0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (755.1) | x | (755.1) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2013 года | **3013** | **178,368.4** | **-** | **15,623.2** | **44,969.2** | **76,705.9** | **315,666.7** |

**ПРИЛОЖЕНИЕ К КОНСОЛИДИРОВАННОМУ ОТЧЕТУ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА**

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2012 ГОД**

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Прибыль | 301211 | | 20,776.4 | 11,171.3 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 26,223.2 | 38,845.2 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств | 3012121 | | 26,223.2 | 38,845.2 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | **ИТОГО совокупный доход** | **30121** | | **46,999.6** | **50,016.5** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2012 ГОД**

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | 16 | 135,208.3 | 97,084.3 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | 16 | (69,172.4) | (58,752.2) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | 17 | 25,226.6 | 14,307.2 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | 17 | (4,731.5) | (3,917.5) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | 18 | 208.4 | 1,209.3 |
| 8 | Чистый доход/ (убыток) по операциям с иностранной валютой | 70106 | 19 | 12,140.3 | (1,439.8) |
| 9 | Чистый убыток по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | 20 | (290.9) | (25.0) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | 22 | 17,808.7 | 3,357.3 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | 23, 24 | (73,611.1) | (43,557.5) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (6,425.9) | (849.3) |
| 13 | Денежная прибыль до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | | 36,360.5 | 7,417.0 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | 1 | 140,152.5 | (113,370.2) |
| 15 | Чистое снижение денежных средств в банках | 70201 | 2 | 14,084.6 | 22,731.9 |
| 16 | Чистое снижение денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | 3 | 9,093.3 | 4,647.5 |
| 17 | Чистый (прирост)/ снижение денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | 4 | (59,246.3) | 26,284.5 |
| 18 | Чистое снижение денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | 8 | 45,147.1 | (18,783.5) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | | 149,231.2 | (78,489.8) |
| 21 | Чистое (снижение)/ прирост денежных средств Национального банка | 70300 | 9 | (51,388.0) | 109,851.4 |
| 22 | Чистое (снижение)/ прирост денежных средств банков | 70301 | 10 | (106,188.9) | 16,231.9 |
| 23 | Чистое (снижение)/ прирост денежных средств клиентов | 70302 | 11 | (9,533.3) | 45,794.4 |
| 24 | Чистое снижение денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | (44,820.0) | (34,774.2) |
| 25 | Чистое снижение денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | (42.1) |
| 26 | Чистое снижение денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | 12 | (19,643.9) | (11,536.2) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | | (231,574.1) | 125,525.2 |
| 28 | **Чистый поток денежных средств, (использованных)/ полученных от операционной деятельности** | **70** | | **(45,982.4)** | **54,452.4** |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | 6, 7 | (6,178.2) | (5,269.4) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | 6, 7 | - | 52.9 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | 5 | 28.7 | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | **Чистый поток денежных средств, использованных в инвестиционной деятельности** | **71** | | **(6,149.5)** | **(5,216.5)** |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 85,000.0 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (755.1) | (1,066.0) |
| 42 | **Чистый поток денежных средств, полученных/ (использованных) от финансовой деятельности** | **72** | | **84,244.9** | **(1,066.0)** |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | (1,047.7) | 20,597.4 |
| 44 | **Чистый прирост денежных средств и их эквивалентов** | **74** | | **31,065.3** | **68,767.3** |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 26 | x | 137,378.1 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 26 | 168,443.4 | x |

**Председатель Правления — В.Н. Горожанкин**
**Главный бухгалтер — М.М. Абраменко**
**Дата подписания: 30 апреля 2013 года**

**Отчетность в полном объеме размещена на официальном сайте ОАО «Паритетбанк» по ссылке http://www.paritetbank.by/about/finance/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 08.05.2013 г. № 5. УНП 100233809.

Deloitte.

ИП «Делойт и Туш»
ул. Короля, 51
Минск, 220004
Республика Беларусь
Тел.: +375 (17) 200 03 53
Факс: +375 (17) 200 04 14
www.deloitte.by

**Независимое аудиторское заключение по финансовой отчетности**

**Акционерам ОАО "Паритетбанк"**

Мы провели аудит прилагаемой годовой консолидированной финансовой отчетности Открытого акционерного общества "Паритетбанк" (далее – "Банк") и его зависимой компании (далее – "Банковский холдинг"), подготовленной в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, включающей консолидированный баланс на 1 января 2013 года и консолидированные отчеты о прибыли и убытках, об изменении капитала и о движении денежных средств за 2012 год, а также пояснительную записку (далее – "годовая консолидированная финансовая отчетность").

**Ответственность руководства за подготовку финансовой отчетности**

Руководство Банковского холдинга несет ответственность за подготовку данной годовой консолидированной финансовой отчетности и ее соответствие законодательству и нормативным актам, регулирующим порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшим в отчетном периоде, а также за соответствие совершенных Банковским холдингом финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь. Данная ответственность включает создание, внедрение и поддержание системы внутреннего контроля за подготовкой и достоверным представлением годовой консолидированной финансовой отчетности, не содержащих существенных искажений ни вследствие злоупотреблений, влияющих на них, ни вследствие ошибок; выбор и применение надлежащей учетной политики; а также применение обоснованных обстоятельствами бухгалтерских оценок.

**Ответственность аудитора**

Наша ответственность состоит в выражении мнения о достоверности данной годовой консолидированной финансовой отчетности на основании проведенного нами аудита. Мы провели аудит, руководствуясь Законом Республики Беларусь от 8 ноября 1994 года № 3373-XII «Об аудиторской деятельности», Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь, правилами аудиторской деятельности ИП «Делойт и Туш», а также нормативными правовыми документами, регулирующими банковскую деятельность. Эти правила требует обязательного соблюдения аудиторами этических норм, а также планирования и проведения аудита с целью получения достаточной уверенности в том, что годовая консолидированная финансовая отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает проведение процедур, необходимых для получения аудиторских доказательств в отношении числовых показателей и пояснений к годовой консолидированной финансовой отчетности. Выбор процедур основывается на профессиональном суждении аудитора, включая оценку рисков существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности вследствие злоупотреблений, влияющих на них, или ошибок. Оценка таких рисков включает в себя рассмотрение системы внутреннего контроля за подготовкой и достоверностью годовой консолидированной финансовой отчетности с целью разработки аудиторских процедур, применимых в данных обстоятельствах, но не для целей выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля Банковского холдинга. Аудит также включает оценку надлежащего характера применяемой учетной политики и обоснованности оценочных показателей, полученных руководством, а также оценку представления годовой консолидированной финансовой отчетности в целом.

Мы считаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточным основанием для выражения мнения о данной годовой консолидированной финансовой отчетности.

**Мнение**

По нашему мнению, данная годовая консолидированная финансовая отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Банковского холдинга по состоянию на 1 января 2013 года, а также результаты его деятельности и движение денежных средств за 2012 год в соответствии с законодательством и нормативными актами, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

Генеральный директор
ИП «Делойт и Туш» А.П. Сурмач

(Квалификационный аттестат аудитора № 0001231 от 21 апреля 2005 года; Свидетельство № 45 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 24 декабря 2008 года.)

Аудитор
ИП «Делойт и Туш» О.И. Степанеева

(Квалификационный аттестат аудитора № 0001765 от 12 ноября 2009 года; Свидетельство № 65 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 14 декабря 2011 года.)

**г. Минск, Беларусь**
**30 апреля 2013 года**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Купалинка» (продавец)

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже изолированного помещения административного назначения, об. пл. 263 кв.м, инвентарный номер 644/D-42207, расположенного по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Метявичское шоссе, 5/2-2.

Начальная цена с НДС – 1 213 020 000 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. Аукцион состоится **12.08.2013** в 16.00 по адресу: г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 58, к. 510. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.08.2013** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5.

**Тел: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**



**ОАО «Гомельхлебопродукт»**

**извещает своих акционеров о проведении внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гомельхлебопродукт» 23 июля 2013 года.**

**Повестка дня:**

1. О даче согласия на увеличение доли Гомельской области в уставном фонде открытого акционерного общества «Гомельхлебопродукт».

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, актовый зал ОАО «Гомельхлебопродукт». Начало в 14.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, тел. (8 0232) 72 59 40.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».**

УНП 400010980



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорскторг» (продавец)

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже **одним лотом** имущества, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Солигорский р-н, р-н станции «Калий-1», уч. 5, в составе **зданий:**

склад продовольственных товаров № 1, инвентарный номер 644/С-34916, об.пл. 1604,9 кв.м; мебельный склад, инвентарный номер 644/С-34933, об.пл. 972,9 кв.м; **сооружения:** подъездной путь к железной дороге протяженностью 405,7 м.

**Начальная цена с НДС – 2 199 747 600 бел. руб.**

Под обслуживание объектов недвижимости сформировано два земельных участка об.пл. 0,5314 га и 0,3498 га, предоставленные продавцу на праве постоянного пользования.

**Задаток 10 % от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.05.2013.

Аукцион состоится **30.07.2013** в 12 ч. 30 мин. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.07.2013** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**
**E-mail: auction@cpo.by.**


■ Людзі справы

# ЯНЫ НЕ СКАРДЗЯЦЦА. ЯНЫ ПРАЦУЮЦЬ

**Калі бізнес у Беларусі толькі пачынаў сваё развіццё, да яго ставіліся хутчэй варожа і з недаверам, чым з тым адценнем прэстыжнасці, з якім многія сёння вымаўляюць слова «бізнесмен». І маладыя зараз хочуць быць бізнесменамі. Але не ўсе пры гэтым разумеюць, што бізнес — гэта не толькі шмат грошай, прыгожая машына і рэспектабельны выгляд, а і вялікая адказнасць, рызыка. Ён патрабуе лідарскіх якасцяў, цвёрдага характару, сапраўднай харызмы, умення не здавацца нават тады, калі шанцаў на перамогу амаль няма. І сёння такіх людзей у Беларусі шмат. Падведзены вынікі конкурсу «Чалавек Справы», які штогод праводзіць грамадская рэдакцыйная рада часопіса «Дело (Восток+Запад)», куды ўваходзяць найбольш аўтарытэтныя беларускія прадпрымальнікі, эканамісты, грамадскія дзеячы. Як ацэньваюць стан беларускай эканомікі тыя, хто сам яе і стварае, пацікавіўся карэспандэнт «Звязды».**

## ЖЫВІ СВАІМ РОЗУМАМ

**Акадэмік, доктар эканамічных навук, прафесар, саветнік Нацыянальнай акадэміі навук Пётр Нікіценка,** які ўзначальвае рэдакцыйную раду, лічыць, што ў цяперашніх няпростых умовах у бізнесе перамагае той, хто абапіраецца на асабістыя сілы і рынкавую філасофію: «Хто жыве сваім розумам, і ў складанай эканамічнай сітуацыі знаходзіць нестандартныя рашэнні. Тыя, для каго прынцыпы самаарганізацыі і асобаснага росту з'яўляюцца фактарамі поспеху». Дарэчы, на конкурс было вылучана 140 кандыдатаў. Па традыцыі з іх адабралі 12 лаўрэатаў. «Але колькасць тых, хто быў рэкамендаваны міністэрствамі эканамічнага блока, аблвыканкамамі, Мінгарвыканкамам і прадпрымальніцкімі саюзамі, абнадзейвае. Гэта значыць, што філасофія вядзення бізнесу ў Беларусі змяняецца да лепшага», — заявіў акадэмік.

## СКЛАДЫ І (БЯС)ПЛАТНЫ ІНТЭРНЭТ

**Віталь Воўк, генеральны дырэктар Мінскага завода колавых цягачоў, лаўрэат конкурсу ў намінацыі «За павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі»,** на пытанне журналістаў, ці будуць зніжацца складскія запасы на нашых прадпрыемствах, адказаў: «За свой завод магу сказаць, што ў нас працэнт запасаў нават меншы, чым патрэбен пры такой вытворчасці. У нас заказаў шмат, таму прадукцыя не затрымліваецца».

А Сяргей Папкоў, генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам», лаўрэат конкурсу ў намінацыі «За высокую якасць бізнес-паслуг», паабяцаў зрабіць да чэмпіянату свету па хакеі столькі пунктаў доступу да інтэрнэту Wi-Fi, колькі трэба. «Іншая справа, што некаторыя з іх не выкарыстоўваюцца, — паскардзіўся кіраўнік. — У аэрапорце ўсталявана 20 пунктаў, але прадукцыйнасць іх выкарыстання толькі 2-3 працэнты. Мы і так працуем практычна на імідж кампаніі і краіны». Сяргей Папкоў запэўніў, што Wi-Fi будзе працаваць на высокіх хуткасцях, але наконт платнасці ці бясплатнасці гэтай паслугі нічога не сказаў: «Гэтае пытанне вырашыцца да канца года».

## $164 ТЫС. НА АДНАГО РАБОТНІКА

Кіраўніцтва краіны патрабуе ад прадпрыемстваў выхад на выпрацоўку 60 тысяч долараў за год на аднаго работніка. На якім узроўні гэты паказчык у лепшых? «Летась у нас было 164 тысячы долараў на аднаго работніка. Сёлета чакаем на 20-25 працэнтаў вышэй», — адказаў **Пётр Катульскі, генеральны дырэктар СТАА «ЛЛК-Нафтан», лаўрэат конкурсу ў намінацыі «За асабісты ўнёсак у дасягненне сусветнага ўзроўню якасці прадукцыі, якая выпускаецца».** «Да 2015-га мы ставім сабе задачу дасягнуць 60 тысяч долараў на чалавека, якія патрабуюцца. За паўгоддзе гэтая лічба прыкладна роўная 22 тысячам», — падзяліўся Віталь Воўк. Віталь Саладуха, генеральны дырэктар ААТ «Інтэграл», лаўрэат конкурсу ў намінацыі «За важкі ўнёсак у развіццё знешнеэканамічных сувязяў Беларусі», быў больш шматслоўным. Ён перасцярог, што прывязвацца толькі да аднаго паказчыка таксама няправільна: «Я ведаю, што расійскія калегі, каб былі добрыя лічбы, вывелі ўсе няпрофільныя актывы са сваіх прадпрыемстваў — ахову, механаапрацоўку і гэтак далей. Гэта цяпер асобныя прадпрыемствы. Вось і атрымліваецца выпрацоўка на аднаго работніка вышэйшай. Але такое размеркаванне дзейнасці ўскладняе вытворчасць. Трэба ў вытворчасці дамагацца такіх значэнняў выручкі, каб не трэба было адсякаць няпрофільныя актывы. У нас сёлета будзе 30 тысяч долараў».

## ІНВЕСТАРЫ ЛЮБЯЦЬ БЕЛАРУСЬ

**Камбіз Бешкардана, дырэктар Лагістычнага цэнтра «Прылессе», лаўрэат конкурсу ў намінацыі «За актыўнае прыцягненне і эфектыўнае выкарыстанне замежных інвестыцый»,** заявіў, што «Беларусь — вельмі прывабная краіна для замежных інвестыцый. Тыя даследаванні, якія мы правялі перад тым, як пачаць інвеставанне, даказалі гэта». Тым больш доказам з'яўляецца тое, што лагістычны цэнтр — гэта не той аб'ект, які прынясе хуткую выручку. «Гэта доўгатэрміновы праект, накіраваны на эканамічнае развіццё краіны», — упэўнены Камбіз Бешкардана.

Па словах арганізатараў конкурсу, ніхто з пераможцаў-замежнікаў не сказаў аб праблемах. Невядома, гэта сціпласць і выхаванасць ці проста жаданне працаваць замест галашэння аб цяжкасцях. Добры прыклад сумленных бізнесменаў, якія гатовы працаваць, нягледзячы на перашкоды.

## У КРЫЗІС РАЗВІВАЮЦЦА ІНАВАЦЫІ

«Вытворчасць высокатэхналагічнай прадукцыі з'яўляецца, на маю думку, найбольш эфектыўным відам бізнесу ва ўмовах крызісу, — распавядае **Уладзімір Лінеў, дырэктар прадпрыемства «Адані», лаўрэат конкурсу ў намінацыі «За стварэнне прадпрыемства, якое падае прыклад пераходу на інавацыйны шлях развіцця».** — Мы працуем без складоў, выконваем заказы як мага хутчэй. Я лічу, што ў краіне павінна з'яўляцца больш высокатэхналагічных прадпрыемстваў. На гэтым будуецца развіццё эканомікі. Не разумею, чаму думаюць, што навука ў бізнесе не можа быць паспяховай. Яна павінна быць паспяховай. Калі вы займаецеся толькі даследаваннямі і не даяце ім практычнага прымянення, то, зразумела, прыбытку ад гэтага не будзе. А калі вырашаць усё комплексна, то праблем няма. Мы робім чыстае імпартазамяшчэнне і прапануем тэхніку, якую раней куплялі толькі за мяжой». Дарэчы, прадпрыемства стала выпускаць унікальнае медыцынскае абсталяванне для ранняга дыягнаставання раку малочнай залозы ў жанчын. А ўвогуле 90% прадукцыі ідзе на экспарт.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■


IdeaBank

Отличная идея!

**ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ**
**На 31 декабря 2012 года**

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2012 года)

| | Прим. | 2012 г. | 2011 г. (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 5 | 435 083 | 224 848 |
| Средства в кредитных организациях | 6 | 72 817 | 4 522 |
| Кредиты клиентам | 7 | 1 216 213 | 476 457 |
| Инвестиционные ценные бумаги: | | | |
| имеющиеся в наличии для продажи | 8 | 4 121 | - |
| Производные финансовые активы | 12 | 260 | 127 192 |
| Основные средства | 9 | 42 954 | 30 174 |
| Нематериальные активы | 10 | 5 982 | 4 479 |
| Прочие активы | 13 | 13 892 | 5 728 |
| **Итого активы** | | **1 791 322** | **873 400** |
| **Обязательства** | | | |
| Средства кредитных организаций | 15 | 92 207 | 24 880 |
| Средства клиентов | 16 | 1 227 180 | 469 299 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 17 | 76 116 | 96 544 |
| Производные обязательства | 12 | 354 | 16 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | 11 | 5 653 | 1 175 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 11 | 19 274 | 7 230 |
| Прочие обязательства | 13 | 24 512 | 9 936 |
| Субординированный займ | 18 | 85 182 | 99 100 |
| **Итого обязательства** | | **1 530 478** | **708 180** |
| **Капитал** | **19** | | |
| Уставный капитал | | 191 626 | 191 626 |
| Нераспределенная прибыль (накопленный убыток) | | 69 218 | (26 406) |
| **Итого капитал** | | **260 844** | **165 220** |
| **Итого обязательства и капитал** | | **1 791 322** | **873 400** |

**ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ**
**за год, закончившийся 31 декабря 2012 года**

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2012 года)

| | Прим. | 2012 г. | 2011 г. (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **Процентные доходы** | | | |
| Кредиты клиентам | | 537 149 | 282 461 |
| Средства в кредитных организациях | | 18 304 | 8 646 |
| Инвестиционные ценные бумаги | | 5 293 | - |
| | | **560 746** | **291 107** |
| **Процентные расходы** | | | |
| Средства клиентов | | (257 023) | (61 055) |
| Средства кредитных организаций | | (23 752) | (26 824) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | | (9 948) | (7 870) |
| | | **(290 723)** | **(95 749)** |
| **Чистый процентный доход** | | **270 023** | **195 358** |
| Расходы по созданию резерва под обесценение кредитов | 7 | (45 599) | (14 238) |
| **Чистый процентный доход после расходов по созданию резерва под обесценение кредитов** | | **224 424** | **181 120** |
| Чистые комиссионные доходы | 21 | 49 660 | 6 518 |
| Чистые расходы по операциям с ценными бумагами | | (28) | - |
| Чистые (расходы)/доходы по операциям в иностранной валюте: | | | |
| – торговые операции | | 35 289 | 127 117 |
| – переоценка валютных статей | | (1 857) | (167 046) |
| Прочие доходы | 22 | 10 419 | 7 005 |
| **Непроцентные (расходы)/доходы** | | **93 483** | **(26 406)** |
| Расходы на персонал | 23 | (63 465) | (35 342) |
| Расходы по аренде и содержанию помещений | | (27 684) | (21 658) |
| Расходы на маркетинг и рекламу | | (9 396) | (8 583) |
| Амортизация | 9,10 | (8 811) | (5 448) |
| Налоги, кроме налогов на прибыль | | (3 390) | (2 440) |
| Убытки от обесценения прочих активов | 14 | (3 175) | (264) |
| Прочие операционные расходы | 23 | (44 668) | (29 424) |
| **Непроцентные расходы** | | **(160 589)** | **(103 159)** |
| Расходы по чистой монетарной позиции | 2 | (35 499) | (66 326) |
| **Прибыль/(убыток) до расходов по налогу на прибыль** | | **121 819** | **(14 771)** |
| Расходы по налогу на прибыль | 11 | (26 195) | (15 802) |
| **Чистая прибыль/(убыток) за год** | | **95 624** | **(30 573)** |
| **Прочий совокупный доход** | | **-** | **-** |
| **Итого совокупный доход/(убыток) за год** | | **95 624** | **(30 573)** |

**ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ**
**За год, закончившийся 31 декабря 2012 года**

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2012 года)

| | Уставный капитал | Нераспределенная прибыль/(накопленный дефицит) | Итого капитал |
|---|---|---|---|
| **На 31 декабря 2010 г.** | **191 626** | **4 167** | **195 793** |
| Итого совокупный убыток за год (пересчитано) | - | (30 573) | (30 573) |
| **На 31 декабря 2011 г. (пересчитано)** | **191 626** | **(26 406)** | **165 220** |
| Итого совокупный доход за год | - | 95 624 | 95 624 |
| **На 31 декабря 2012 года** | **191 626** | **69 218** | **260 844** |

**ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ**
**За год, закончившийся 31 декабря 2012 года**

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2012 года)

| | Прим. | 2012 г. | 2011 г. (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **Денежные потоки от операционной деятельности** | | | |
| Проценты полученные | | 551 231 | 304 259 |
| Проценты выплаченные | | (283 901) | (85 809) |
| Реализованные доходы за вычетом расходов по операциям с иностранной валютой | | 143 629 | (52 986) |
| Комиссии полученные | | 61 464 | 14 024 |
| Комиссии выплаченные | | (11 804) | (8 036) |
| Чистый убыток по операциям с инвестиционными ценными бумагами, имеющимися в наличии для продажи | | (28) | - |
| Прочие доходы полученные | | 9 436 | 7 006 |
| Расходы на персонал, аренду и прочие операционные расходы выплаченные | | (153 363) | (95 985) |
| **Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах** | | **316 664** | **82 473** |
| Чистое (увеличение)/уменьшение операционных активов | | | |
| Средства в кредитных организациях | | (62 294) | (3 393) |
| Кредиты клиентам | | (857 279) | (311 546) |
| Прочие активы | | (8 169) | (2 473) |
| Чистое увеличение/(уменьшение) операционных обязательств | | | |
| Средства кредитных организаций | | 69 903 | (392) |
| Средства клиентов | | 826 431 | 291 125 |
| Прочие обязательства | | 14 555 | 4 145 |
| **Чистое поступление денежных средств от операционной деятельности до налога на прибыль** | | **299 811** | **59 939** |
| Налог на прибыль уплаченный | | (8 169) | (9 706) |
| **Чистое поступление денежных средств от операционной деятельности** | | **291 642** | **50 233** |
| **Денежные потоки от инвестиционной деятельности** | | | |
| Поступления от реализации основных средств | | 1 496 | 541 |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | | (23 323) | (25 039) |
| Покупка ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи | | (3 824) | - |
| **Чистое расходование денежных средств от инвестиционной деятельности** | | **(25 651)** | **(24 498)** |
| **Денежные потоки от финансовой деятельности** | | | |
| Поступления от выпуска долговых ценных бумаг | | | 122 491 |
| Погашение долговых ценных бумаг | | (12 024) | (6 465) |
| **Чистое (расходование)/поступление денежных средств от финансовой деятельности** | | **(12 024)** | **116 026** |
| Монетарный убыток от денежных средств и их эквивалентов | | (50 317) | (61 346) |
| Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты | | 6 585 | 65 296 |
| **Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов** | | **210 235** | **145 711** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года** | **5** | **224 848** | **79 137** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года** | **5** | **435 083** | **224 848** |

ЗАО «Идея Банк», лицензия № 25 от 03.06.2013, выдана НБ РБ, УНП 807000122

ERNST & YOUNG

**Ernst & Young LLC**
Korol Street, 51, 2nd floor, office 30
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 209 4535
Fax: +375 (17) 209 4534
www.ey.com/belarus

**ИООО «Эрнст энд Янг»**
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Короля, 51, 2 этаж, офис 30
Тел.: +375 (17) 209 4535
Факс: +375 (17) 209 4534

## Заключение независимых аудиторов

**Акционерам и Совету директоров закрытого акционерного общества «Идея Банк»**

Мы провели аудит прилагаемой финансовой отчетности закрытого акционерного общества «Идея Банк» (далее по тексту – «Банк»), которая включает отчет о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2012 года, отчет о совокупном доходе, отчет об изменениях в капитале и отчет о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также информацию о существенных аспектах учетной политики и другую пояснительную информацию.

*Ответственность руководства в отношении финансовой отчетности*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и достоверное представление данной финансовой отчетности в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, а также за процедуры внутреннего контроля, необходимые, по мнению руководства, для обеспечения подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибки.

*Ответственность аудиторов*

Наша обязанность заключается в том, чтобы выразить мнение о данной финансовой отчетности на основе проведенного аудита. Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита. Данные стандарты требуют, чтобы мы соблюдали этические нормы и спланировали и провели аудит с тем, чтобы получить достаточную уверенность в отсутствии существенного искажения финансовой отчетности.

Аудит включает выполнение процедур, направленных на получение аудиторских доказательств в отношении сумм и информации, представленных в финансовой отчетности. Выбор процедур основывается на суждении аудитора, включая оценку риска существенного искажения финансовой отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибки. При оценке этого риска аудитор рассматривает аспекты внутреннего контроля в отношении подготовки и достоверного представления финансовой отчетности с тем, чтобы определить процедуры аудита, необходимые в конкретных обстоятельствах, а не для выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля организации. Аудит также включает оценку уместности выбранной учетной политики и обоснованности бухгалтерских оценок, сделанных руководством Банка, а также оценку представления финансовой отчетности в целом.

Мы считаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими для выражения нашего мнения.

*Мнение*

По нашему мнению, финансовая отчетность во всех существенных аспектах достоверно отражает финансовое положение закрытого акционерного общества «Идея Банк» на 31 декабря 2012 года, а также его финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности.

Ernst & Young LLC

18 июня 2013 года


# ВАЖКІ КЛОПАТ ПРА МАТУХНУ-ПРЫРОДУ








На палігоне цвёрдых бытавых адходаў «Паўночны» каля вёскі Прымор'е Мінскага раёна адбылося адкрыццё электрастанцыі — як вынік паспяховай рэалізацыі новага беларуска-швейцарскага праекта кампаніі TDF Ecotech AG. Планавая магутнасць першай чаргі станцыі — 2,8 МВт. Асноўная задача ўстаноўкі актыўнай дэгазацыі — экалагічна чыстае выкарыстанне газаў, якія атрымліваюцца падчас гніення арганічных адходаў на звалках (сметніках).

У Беларусі ўстаноўкі па атрыманні электрычнасці са смеццевага газу працуюць з 2010 года. Тры гады таму кампанія TDF Ecotech AG ужо запусціла ў эксплуатацыю аналагічную электрастанцыю пад Мінскам на колішняй звалцы «Трасцянец».

У адкрыцці аб'екта прыняў удзел намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Анатоль Шагун *(на фота)*, прадстаўнікі Мінскага аблвыканкама, спецыялісты са Швейцарыі і Германіі.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## ЖЭСы ПРОСЯЦЬ МІНЧАН ПАВЕДАМЛЯЦЬ ПРА ДЭФЕКТЫ БАЛКОНАЎ

**Пры выяўленні якіх-небудзь пашкоджанняў балкона ўладальніку неабходна ў самыя кароткія тэрміны паведаміць пра гэта ў дыспетчарскую ЖЭС.**

Як распавёў намеснік дырэктара па вытворчасці ЖРЭА Савецкага раёна Дзяніс Драпей, дробны рамонт выконваецца за кошт ЖРЭА на працягу месяца. Часцей за ўсё прыходзяць у непрыдатнасць балконы ў панэльных дамах. Сцены ў такіх будынках значна танчэйшыя, чым у іншых, а значыць, мацаванне канструкцый менш надзейнае. Найбольш бяспечнымі можна лічыць лоджыі: пліта асновы ў іх не толькі ўтоплена ў апорнай сцяне, але і замацавана з абодвух бакоў.

**«Мінск—Навіны».**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)**

Извещает о снятии с аукционных торгов, назначенных на 16.07.2013г., имущества ОАО «Гомельский АРЗ» (лот 1-8), согласно извещению от 14.06.2013г. в газете «Звязда».



Утерянные представительством Белгосстраха по Фрунзенскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ с № 0411267 по № 0411270 **считать недействительными.**

*УНП 101883943*



Утерянное свидетельство о гос. регистрации ЗАСО «ФаворСК» **считать недействительным.**

*УНП 100922638*



Утерянный страховой полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА № 0278710 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**



Открытое акционерное общество «Паритетбанк»,

расположенное по адресу: 220002, г.Минск, ул. Киселёва, 61а,

сообщает, что 30 июля 2013 года в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» от 27.06.2013, протокол №14, проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме с повесткой дня:

1. О процедурных вопросах.
2. О некоторых вопросах деятельности Независимых директоров.
3. Об утверждении Положения «О Наблюдательном Совете ОАО «Паритетбанк».

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 1 июля 2013 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетени для заочного голосования и ознакомиться с материалами к собранию участники собрания могут по адресу: г.Минск, ул.Киселёва, 61а, комн.205 — 22 июля 2013 года и 23 июля 2013 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 26 июля 2013 года по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров, дата подсчета голосов – 29 июля 2013 года.

Принявшими участие во внеочередном Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Паритетбанк» в указанном порядке, которые включаются в одноименный список.

Телефон для справок: 288 64 74.

Правление ОАО «Паритетбанк».

*УНП 100233809*

■ На чамаданах

# ПЛЯЖНЫ ЎБОР... НЯТАННЫ НАБОР!



**Пазагараць на сонейку ля цёплага мора ці на беразе возера альбо рэчкі... Многія лічаць такі від летняга адпачынку пасіўным, але, тым не менш, ён не губляе сваёй папулярнасці. Каб добра адпачыць, трэба адпаведна падрыхтавацца. Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала знайсці самыя неабходныя рэчы для пляжнага адпачынку і параўнаць кошты на іх ва ўнівермагу, на рынку і ў буйным гандлёвым цэнтры. Пакуль дабіралася туды, раздумвала, якія ж рэчы варта ўключыць у базавы «пляжны набор». Купальнік, вядома ж; таксама спатрэбяцца пляжныя шлёпанцы, каб зручна было прагульвацца па гальцы ці крыху калючым «травяным» беларускім пляжы. Не лішняй будзе вялікая хустка з лёгкай тканіны — парэа: ім зручна карыстацца як пляжнай сукенкай ці спаднічкай. Таксама ў лік неабходных на адпачынку рэчаў былі ўнесены галаўны ўбор (у нашым выпадку — капялюш), пляжная торба і сродак для загару. Што ж, са спісам вызначыліся, цяпер варта паглядзець, колькі ж каштуюць рэчы, што ў яго ўваходзяць.**

## УНІВЕРМАГ: МІНІМУМ КУПАЛЬНІКАЎ І ПРАКТЫЧНЫЯ ТОРБЫ

Першым на маім шляху быў універмаг. Пачаць давялося з пошукаў купальніка. Мяркуючы па асартыменце, ладная колькасць аматарак схадзіць на пляж ужо «прайшлася» па купальніках ва ўнівермагу сваім пільным вокам і большасць таго, што засталося, стыльным ці нават проста «сімпатычным» назваць нельга. Тым не менш коштам усё ж пацікавіцца трэба. Самы танны купальнік, які ўдалося знайсці ва ўнівермагу, каштуе 217 тысяч рублёў, а самы дарагі (суцэльны, у сінюю палоску) — крыху больш за 380 тысяч рублёў. Але трэба памятаць, што, паколькі выбар невялікі, можна і не «адкапаць» рэч патрэбнага памеру.

Самы час ісці выбіраць шлёпанцы. Кінуўшы погляд на яркі «пластыкавы» абутак коштам крыху больш за 40 тысяч рублёў, адразу ж адхіліла такі варыянт, нягледзячы на лічбу цэнніка. Усё ж хочацца на пляжы выглядаць прыгожа. А вось гумовыя шлёпанцы, што носяцца «праз палец», выглядаюць параўнання няблага. Каштуюць такія ад 60 тысяч. За 180 тысяч рублёў можна набыць шлёпкі не з гумы, а скураныя з драўлянай падэшвай. Застаецца знайсці парэа. Першае, якое спадабалася — аранжавае ў белыя кветачкі. Каштуе 115 тысяч. Як аказалася, гэта і ёсць самы танны варыянт. Можна яшчэ прыгледзецца да парэа-тунікі (кавалак тканіны не суцэльны, а з дзіркай пасярэдзіне, рэч можна апранаць «праз галаву»), яго можна набыць, заплаціўшы крыху больш за 180 тысяч рублёў.

Засталося выбраць капялюш і торбу. Так, за 53 тысячы рублёў можна набыць шыракаполы капялюш, сплецены з сінтэтычнага матэрыялу. Дзесьці ў прамежку ад 110 да 150 тысяч рублёў каштуюць капелюшы з аздобай (стужачка ці больш складанае пляценне, таксама сінтэтычныя). Самым дарагім аказаўся капялюш з саломкі, за які пакупніцы давялося б аддаць больш за 220 тысяч рублёў.

Пошук торбы ва ўнівермагу аказаўся самай лёгкай справай. Торбачак, у якія зручна складваць патрэбныя на пляжы рэчы, аказалася шмат і па розных коштах. Нават набыўшы самую танную і невялікую (за 42 тысячы рублёў), можна не сумнявацца, што ўгадала з выбарам. Рэч пашыта якасна, ды яшчэ і з вясёлым малюнкам. Самы дарагі варыянт, што знайшоўся — рэч «два ў адным». Пакуль ідзеш на пляж — гэта сумка з усім патрэбным. Пасля можна расшпіліць спецыяльную маланку і ператварыць сумку ў дыванок (ён мяккі і досыць трывалы), які зручна пасцяліць на пляжы. Каштуе такая торба 394 тысячы рублёў.

Сродкі для загару знайшліся разнастайныя. Як беларускай вытворчасці, так і замежнай. Разбежка ў кошце вельмі вялікая: можна спыніцца на беларускім ласьёне за 20 з нечым тысяч, а можна набыць і замежны за 160 тысяч рублёў, што, як сведчыць інфармацыя на этыкетцы, не толькі дапаможа не «спаліць» скуру, а яшчэ і паспрыяе хуткаму з'яўленню жаданага бронзавага загару. Здаецца, усё. Цяпер застаецца падлічыць, у колькі абыдзецца мінімальны пляжны набор, калі набываць яго ва ўнівермагу.

**Купальнік — 217 тысяч**
**Шлёпанцы — 40 тысяч**
**Парэа — 115 тысяч**
**Капялюш — 53 тысячы**
**Торба — 42 тысячы**
**Сродак для загару — 20 тысяч**

Мінімальны кошт «пляжнага набору»: 487 тысяч рублёў.

## РЫНАК: ПАРЭА-ТРОХКУТНІКІ І ЗАМЕЖНАЯ «СОНЕЧНАЯ» КАСМЕТЫКА

Выбраць купальнік на рынку аказалася справай прасцейшай. Тут і прапанова аказалася большай, і кошт, як ні дзіўна, крыху ніжэйшым. «Бікіні» без аздобы, з аднатоннай тканіны, можна набыць за 200 тысяч рублёў. 300—350 тысяч — гэта кошт крыху больш цікавых мадэляў. Знайшоўся і адзін купальнік за 450 тысяч. Як расказала прадавец, рэч гэтая не кітайская, а польскай вытворчасці, таму і кошт большы. Тым не менш на выгляд якасць нічым не адрознівалася ад большасці купальнікаў, што давялося пабачыць на рынку.

Самыя танныя пляжныя шлёпанцы на рынку каштавалі 60 тысяч. Крыху ўдасканалены іх варыянт, з дадатковым рэльефам на падэшве і больш шырокімі лямкамі, прадавалі ўжо за 140 тысяч. Калі не шкада 250 тысяч рублёў, можаце для перамяшчэння па вадзе і пяску набыць скураныя.

Выбраць парэа таксама ўдалося хутка. У прадаўцоў амаль для кожнага купальніка яно ёсць у тон. Звычайныя, прамавугольнай формы з махрамі па краях, каштуюць мінімум 100 тысяч рублёў. Крыху большыя, клінападобнай формы, абыдуцца на 30 тысяч даражэй.

Кошты на капелюшы здзівілі сваёй «аднастайнасцю». Ва ўсіх прадаўцоў, у каго ні пыталася, нібыта акцыя нейкая — любы капялюш за 100 тысяч. Ці ён маленькі, ці вялікі — няважна.

Далей на чарзе торба. Вось гэтую рэч знайсці на рынку аказалася цяжкавата. Дамскіх, дарожных сумак — гэта вам калі ласка, а вось менавіта пляжных вельмі мала. Тыя, што знайшліся, каштавалі ад 80 да 100 тысяч рублёў.

Наступнай у пошуку была чарга сродкаў для загару. На рынку не знайшлося беларускай «сонечнай» касметыкі, а кошты на замежную пачыналіся ад 50 тысяч. Самы дарагі варыянт — ласьён для загару — каштаваў 160 тысяч рублёў.

**Купальнік — 200 тысяч**
**Шлёпанцы — 60 тысяч**
**Парэа — 100 тысяч**
**Капялюш — 100 тысяч**
**Торба — 80 тысяч**
**Сродак для загару — 50 тысяч**

Мінімальны кошт «пляжнага набору»: 590 тысяч рублёў.

## ГАНДЛЁВЫ ЦЭНТР: «ДАРМАВЫЯ» КАПЕЛЮШЫ І ПЛЯЖНЫЯ «ШАЛІКІ»

Шукаць патрэбныя рэчы ў гандлёвым цэнтры здалося самым зручным варыянтам. Супрацоўнікі, відаць, вельмі хутка рэагуюць на жаданні сваіх пакупнікоў, і таму акурат у разгар сезону адпачынкаў у гандлёвым цэнтры ўсе патрэбныя для гэтага рэчы сабралі на адной пляцоўцы. Так што засталося толькі выбраць неабходнае. Купальнікі тут прапануюць па кошце ад 146 да 440 тысяч рублёў. Шлёпанцы можна набыць, патраціўшы ад 41 да 80 тысяч.



Парэа выбар не вельмі вялікі. Некаторыя хутчэй нагадваюць звычайныя шалікі, чым адмысловы пляжны аксесуар. Самы маленькі кошт на яго ў гандлёвым цэнтры — 49 тысяч рублёў. Найбольш дарагое парэа абыдзецца ў 120 тысяч рублёў.

На капелюшы акурат была акцыя: стаць уладальнікам вышэйзгаданай рэчы можна, заплаціўшы ад 18 да 20 тысяч рублёў. Амаль задарма! Капелюшы саламяныя, але за такі кошт спадзявацца на якасць не даводзіцца. Тым не менш іншага выбару не было.

Пляжныя торбы знайшліся выключна вялікія. Не для ўсіх такую будзе зручна браць з сабой. Каштавалі яны 75—99 тысяч рублёў.

За самы танны крэм для загару ў гандлёвым цэнтры давядзецца аддаць 31 тысячу. А самы дарагі сродак, што прапануюць у гандлёвым цэнтры, абыдзецца ў 60 тысяч рублёў.

**Купальнік — 146 тысяч**
**Шлёпанцы — 41 тысяча**
**Парэа — 49 тысяч**
**Капялюш — 18 тысяч**
**Торба — 75 тысяч**
**Сродак для загару — 31 тысяча**

Мінімальны кошт «пляжнага набору»: 360 тысяч рублёў.

**P. S.** Што ж у выніку? Месцам, дзе тэарэтычна можна набыць найбольш танна неабходныя для паходу на пляж рэчы, аказаўся гандлёвы цэнтр. Але ж «эканомія» гэтая досыць умоўная, бо не факт, што ўсе самыя танныя рэчы будуць падыходзіць менавіта вам. Самыя дарагія пакупкі для пляжу вы зробіце, як ні дзіўна, на рынку. У чымсьці з гэтым можна змірыцца: ну і што, што пераплаціш, затое выбар, напрыклад, купальнікаў там нашмат багацейшы, чым у двух астатніх месцах. У «серадняках» — універмаг, мінімальны «пляжны» візіт у які каштуе 487 тысяч рублёў. Гэта з улікам таго, што рэчы выбіраліся для аднаго дарослага чалавека. Відавочна, што калі даводзіцца збіраць на пляж усю сям'ю, мінімальны кошт «пляжнага набору» вырастае ў некалькі разоў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

# КАЗКІ І ПРЫГОДЫ — ДЗЕЦЯМ:
## ЧЫТАННЕ НА БЕРАЗЕ НАРАЧЫ

**У Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым лагеры «Зубраня» стартавала акцыя «Пісьменнікі — дзецям», заснаваная Міністэрствам інфармацыі краіны і выдавецкім домам «Звязда».**

І пачаўся новы творчы праект, звязаны з распаўсюджваннем кніг, пашырэннем чытацкай прасторы сярод школьнікаў, з прадстаўлення серыі «Казачны куфэрак». Першая ластаўка ў шэрагу кніг, задуманых і спраектаваных выдавецкім домам «Звязда», — зборнік казак сучасных беларускіх пісьменнікаў «Куды блінок закаціўся». З кнігай дзяўчынак і хлопчыкаў знаёміла выдавецкі рэдактар Вольга Аляксеева, якая і ўклала зборнік. А падарылі чытачу свае казкі Генадзь Аўласенка, Алесь Бадак, Раіса Баравікова, Анатоль Бензярук, Анатоль Бутэвіч, Расціслаў Бензярук, Пятро Васючэнка, Віктар Гардзей, Валерый Кастручын і іншыя паэты і празаікі.

— Кнігі, адрасаваныя дзецям, — адзін з галоўных прыярытэтаў дзяржаўнай выдавецкай палітыкі, — зазначыла на адкрыцці акцыі «Пісьменнікі — дзецям» першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія Ананіч. — І выдатна, што лепшыя здабыткі сучасных паэтаў, празаікаў выкладзены ў такія вось якасна падрыхтаваныя і прыгожа аформленыя кнігі, як зборнік казак, прадстаўлены вам сёння.

Дзеці не толькі слухалі пісьменнікаў і выдаўцоў, яны пазнаёмілі гасцей з уласнай творчасцю. А яшчэ наладзілі конкурс чытальнікаў, у час якога гучалі вершы вядомых беларускіх і рускіх паэтаў.

— «Пісьменнікі — дзецям» — той творчы праект, які мы збіраемся рэалізоўваць не толькі ўлетку, — пракаментавала новую акцыю намеснік дырэктара выдавецкага дома «Звязда» Ала Корбут. — З кніжнымі навінкамі праедзем па ўсёй краіне. Вось-вось з друкарняў прыйдуць новыя цікавыя кнігі. З імі і з іх аўтарамі — Наталляй Ігнаценка, Аленай Масла, Генадзем Аўласенкам, Алесем Бадаком, Уладзімірам Мазго, Віктарам Гардзеем мы збіраемся пазнаёміць усё новых і новых юных чытачоў.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# «ІВАН-ВІЛІС» НА ПАСТАМЕНЦЕ

**Першы афіцыйны аўтамабіль дарожнай інспекцыі — «ГАЗ-67» урачыста заехаў на пастамент ля ўвахода ў гомельскую абласную Дзяржаўтаінспекцыю. Тут ён застанецца назаўжды. Інспектары жартуюць, што гэты помнік нават можа прайсці тэхагляд. Дарэчы, ён амаль аднагодак ДАІ, якая сёлета адзначае 77-годдзе.**

Рарытэтную машыну паўтара года збіралі па частках — для гэтага давялося разабраць цэлыя тры аналагічныя аўтамабілі. Гэта — так званы «Іван-Віліс», які быў створаны савецкімі канструктарамі ў пачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя і вельмі нагадваў амерыканскі армейскі пазадарожнік Willys. Рускаму джыпу у войсках далі мянушку «Іван-Віліс». Па расказах ветэранаў, гэта быў вельмі добры аўтамабіль, які можна было эксплуатаваць пры любым надвор'і на любой мясцовасці.



На ўзбраенні супрацоўнікаў міліцыі потым былі больш дасканалыя, камфортныя, хуткасныя аўтамабілі, але пра свайго першага баявога таварыша не забывалі: аўтамабіль ставілі ў адзін шэраг з новай тэхнікай пры правядзенні страявых аглядаў, пакуль у яго не выйшлі са строю жыццёва важныя дэталі. Потым доўгі час ён самотна чакаў: здадуць на металалом ці адновяць? Некалькі гадоў таму старэнькае рарытэтнае аўто па рашэнні кіраўніцтва ўпраўлення ДАІ было адпраўлена на рэстаўрацыю. У памяць пра заслугі гэтай машыны перад міліцыяй яе вырашылі паставіць на пастамент. Гэта ўжо трэці помнік аўтамабілям ДАІ ў Гомельскай вобласці. У Калінкавічах на пастаменце ўсталявана міліцэйская «капейка» — «ВАЗ-2101», у Хойніках — «Волга».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1551** год — завяршылася будаўніцтва Гродзенскага каралеўскага палаца па праекце архітэктара М.Д. Пёпельмана. Гэта помнік архітэктуры сталага барока. Пабудаваны на месцы Ніжняга замка. У стварэнні палаца прымалі ўдзел архітэктары І.Х. Яух і І.Ф. Кнобель (апошні часткова змяніў праект і ўбудаваў палацавы касцёл). П-падобны ў плане двухпавярховы палац утвараў адкрыты парадны двор, які з боку Гродзенскага Старога замка замыкаўся аднапавярховымі флігелямі. Інтэр'еры касцёла, Сенатарскай, Пасольскай і Круглай залаў былі ўпрыгожаны жывапісам і стукавай ляпнінай у стылі ракако. Палац у гады мінулай вайны быў спалены нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля перабудаваны, у ім размяшчаўся Гродзенскі абкам партыі.

**1943** год — 70 гадоў таму, у ходзе Курскай бітвы, у раёне Прохараўкі адбылася найбуйнейшая ў Другой сусветнай вайне сустрэчная танкавая бітва, якая скончылася паражэннем нямецка-фашысцкай групоўкі, што вяла наступленне. У гэты ж дзень сіламі Бранскага, Цэнтральнага і Заходняга франтоў пачалася Арлоўская стратэгічная наступальная аперацыя (кодавая назва «Кутузаў»). Завяршылася яна 18 жніўня. Савецкія войскі вызвалілі гарады Волхаў, Арол, Карачоў і прасунуліся ў заходнім напрамку на 159 кіламетраў.



**1957** год — нарадзіўся (вёска Адамаўка Чашніцкага раёна) Уладзімір Аляксандравіч Мядзведскі, беларускі вучоны ў галіне сельскай гаспадаркі, доктар сельскагаспадарчых навук (1998), прафесар (2000). Аўтар навуковых прац па спосабах павышэння натуральнай рэзістэнтнасці арганізма жывёл, распрацоўцы мінеральных кармавых дабавак з мясцовай прыроднай сыравіны, экалагічных аспектах аховы навакольнага асяроддзя.

Было сказана

**Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:**

***«Згода — сіла грамады».***

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Магнолія. Архідэя. Карат. Віно. Амар. Карп. Бомба. Ліра. Аорта. Кат. Лотас. Вёска. Куб. Кар. Абак. Абух. Адэса. Каракум. Вар. Ларга. Гага. Атава. Манат. Пакт. Абардаж. Горка. Задатак. Антракт.

**Па вертыкалі:** Эдэльвейс. Ава. Трэст. Адат. Бэра. Кактус. Бужака. Ара. Хала. Інкі. Табу. Прага. Анапа. Угра. Рок. Ром. Кадр. Аер. Карт. «Ака». Ротар. Ажан. Балада. Брага. Матыка. Кан. Акруга. Балансір. Матарыст.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.53 | 21.37 | 16.44 |
| Віцебск | — 4.35 | 21.34 | 16.59 |
| Магілёў | — 4.43 | 21.27 | 16.44 |
| Гомель | — 4.48 | 21.15 | 16.27 |
| Гродна | — 5.10 | 21.50 | 16.40 |
| Брэст | — 5.19 | 21.42 | 16.23 |

**Месяц**

***Першая квадра 16 ліпеня. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *СВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА.*
***К.*** *Веранікі, Веры, Яніны, Андрэя, Брунона, Васіля, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

«Ваўкі ў нас цывілізаваныя», — кажуць сібіракі. — «Паштальёна з'ядуць, а пошту не крануць».

**Жонка — мужу:**
**— Трэба паставіць вочка ў халадзільнік, а то адкрыеш дзверцы і гадзіну думаеш, чаго б паесці.**

На станцыі метро:
— Таварыш міліцыянер, мяне абрабавалі. Злодзей кашалёк зрэзаў.
— Вы яго запомнілі, асаблівыя прыкметы ёсць?
— А як жа! У яго падраная скураная куртка, пералом правай рукі і напаўадрыванае левае вуха.

**Пакручваючы халодны кран на кухні, муж навучыўся карэктаваць тэмпературу вады «інтэнсіўнасць» жонкі, якая спявала ў душы.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.901. Індэкс 63850. Зак. № 3055.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 ліпеня 2013 года.